Пралетарыі усіх краін, злучайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі

№ 19
кастрычнік
1935

Адказная па лёну т. Часновіч прымае лён у лепшай трапальшчыцы т. Альхімёнка Паўліны.
(Калгас „Парыжская Комуна" Аршанскага раёна)

Фота Я. Салавейчыка.

„Пастанова Соўнаркома СССР і Цэнтральнага Камітэта партыі аб зніжэнні цэн на хлеб і адмене картачнай сістэмы на мяса, рыбу, цукар, тлушчы і бульбу з'яўляецца сведчаннем буйнейшых поспехаў, дасягнутых комуністычнай партыяй і совецкай уладай у барацьбе за выкананне важнейшага гаспадарчага задання другой пяцігодкі—павысіць узровень спажывання працоўных у 2—3 разы".

(З перадавога артыкула „Правды")

БЕЗ КАРТАК

Адмена картачнай сістэмы і зніжэнне цэн паказваюць, якімі клопатамі акружае партыя і совецкая ўлада працоўныя масы. З кожным днём усё больш паляпшаецца наша жыццё і гэта дзякуючы нашай партыі і асабіста тав. Сталіну.

Мне адмена картачнай сістэмы і зніжэнне цэн даюць вялікую эканомію. Цяпер я кожны дзень купляю для свайго дзіцяці булачку, мяса, курачку, вінаград, малако.

1 кастрычніка, калі я ў мясной лаўцы купіла курачку, мой чатырохгадовы сынок радасна ўскрыкнуў:

— Вось, мамуська, як добра нам зараз. Ты ўжо мне часта будзеш купляць мяска, курачку і вінаграду, а раней ты рэдка мне гэтага купляла.

Вось гэту радасць, якую адчуў нават мой маленькі Артурык, яна жыве ва ўсіх нас. Мы штодзенна бачым, як шпарка мы расцем, як блізка наша светлая будучыня — соцыялістычнае грамадства.

Работніца фабрыкі «Кастрычнік» **Е. СПЕКТАР.**

г. Менск.

ШТОМЕСЯЧНА 50 руб. ЭКАНОМІІ

З вялікай радасцю наша сям'я сустрэла пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб зніжэнні цэн і адмене картачнай сістэмы на прадукты харчавання.

Як палепшылася наша жыццё! Мы ўжо прыблізна падлічылі, што ў сувязі са зніжэннем цэн у нас штомесячна астаецца звыш 50 руб. эканоміі.

Я цяпер маю тыя прадукты, якіх раней у мяне не было. Кожны дзень купляем у дастатковай колькасці масла, сыр, мяса, кураняты, больш фруктаў. Цяпер і на рынку ўсё стала танней.

У раёне, дзе я жыву, па Неміга-Ракаўскай, харчовыя магазіны Горспажыўсаюза і Менхарчгандля не дрэнна абслугоўваюць пакупнікоў.

У мяне двое дзяцей-школьнікаў. Раней у іх не было партфелей. Цяпер абавязкова куплю ім партфелі на грошы, якія я эканомлю на прадуктах харчавання. Цяпер наша сям'я мае магчымасць і жыць больш культурна, часта наведваць кіно і тэатр.

Работніца друкарні «Звязда» **ЛАВІТ.**

г. Менск.

НА УСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЛЁЦЕ МАЙСТРОЎ ІЛЬНУ

З 8-га па 11-е кастрычніка ў зале з'ездаў Дома ўрада ў Менску адбыўся ўсебеларускі злёт лепшых калгаснiц - трапальшчыц рэспублікі.

На здымку: старшыня ЦВК СССР і БССР тав. **Чарвяноў** агля-дае якасць ільновалакна на выстаўцы, якая была арганізавана да злёта.

Фота ГРЫНА.

ЗА ТЭМПЫ І ЯКАСЦЬ

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 117

Сартыроўшчык трасты калгаса «Падрэзы», Іваньскага сельсовета, Чашніцкага раёна, тав. **Падрэза Іван Паўлавіч** у сваім пісьме, адрасаваным «Звяздзе», пісаў: «Я ганаруся сваёй кваліфікацыяй. Лён мяне паставіў на ногі. Я ў калгасе стаў знатным майстрам ільну. З кожным годам станаўлюся ўсё багацей і багацей».

Так піша не адзін толькі Падрэза Іван. У сотнях пісем, артыкулах, надрукаваных у цэнтральным і раённым друку, калгаснікі і калгасніцы выказваюць сваю вялікую любоў да ільну. Гэтыл калгасныя майстры барацьбы за лён лічбамі і фактамі даказваюць усю карысць ударнай апрацоўкі ільну для дзяржавы, калгасаў, для саміх калгаснікаў.

1 сапраўды, калгас, у якім працуе т. Падрэза Іван Паўлавіч, павінен у гэтым годзе атрымаць за лён 22 тыс. руб. Сартыроўшчыцы, трапальшчыцы, мяльшчыцы, сушыльшчыкі збіраюцца за атрыманыя грошы за лён набыць сабе кардітуры, пальто, фетравыя боты, мэблю, патэфоны, веласіпеды і іншыя каштоўныя рэчы.

Лён — гэта вялікая крыніца заможнасці.

Пад кіраўніцтвам нашай партыі выхаваны дзесяткі тысяч энтузіястаў барацьбы за лён: трапальшчыц, сартыроўшчыц, мяльшчыц і т. д. Тысячы калгасніц вылучаны намеснікамі старшынь калгасаў па ільну. Па сутнасці намеснікі па ільну кіруюць усімі працэсамі апрацоўкі трасты і здачы ільну. На іх партыя і ўрад ускладалі вялікую адказнасць за тэмпы і, галоўнае, за якасць апрацоўкі ільну на кожным участку.

Калгасы ордэнаноснай Совецкай Беларусі як ніколі ўзброены ільнаапрацоўчымі машынамі, аблягчаючымі працу калгаснікаў. Машыны, выпушчаныя совецкімі заводамі, рукамі рабочага класа, сталі на службу заможнасці калгасаў і калгасніц. У большасці калгасаў пушчаны ў ход ільнатраталкі «Санталава», «Гарлачова», «Антонава», сканструяваныя калгаснымі майстрамі.

Адданасць калгаснікаў гэтай важнейшай тэхнічнай культуры сказваецца на кожным мяльна-сушыльным пункце, у кожнай брыгадзе, у кожным звяне. Не дарма ў паход імя тав. **Гікало** за лён уключыліся дзесяткі і сотні тысяч калгаснікаў і калгасніц. Кожны дзень барацьбы за пяршынства ў паходзе выяўляе ўсё новых і новых энтузіястаў. Пяцідзесяцігадовая калгасніца **Янкоўская** Наста з сельгасарцелі «Парыжская Комуна», Аршанскага раёна, выпрацоўвае штодзенна 7 кгр. ільну не ніжэй 15—16 нумару. Такіх Янкоўскіх у нашых раёнах і калгасах вельмі і вельмі многа.

Справа заключаецца толькі ў тым, каб зараз, у самы рашаючы перыяд барацьбы за лён, уцягнуць літаральна ўсіх калгасніц у паход імя тав. **Гікало,** вышэй узняць сцяг спаборніцтва за пяршынства.

Іменна ад таго, як будуць мабілізаваны калгаснікі, правільна расстаўлены сілы, рацыянальна скарыстаны кожны чалавек у калгасе, брыгадзе, звяне, іменна ад таго наколькі будуць скарыстаны ўсе да адной ільнаапрацоўчыя машыны, — залежыць паспяховае завяршэнне пахода.

Але вось гэтага асноўнага не зразумелі яшчэ ў многіх раёнах. У паасобных раёнах разважаюць так:

— Што-ж, моў, машынамі калгасы забяспечаны, кваліфікаваных людзей хапае — значыць справа забяспечана.

Гэтыя разважанні прыводзяць да велізарнейшых прарываў, да недапушчальнага адставання. Іменна пагардлівыя адносіны да разгортвання партыйна-масавай работы, да сацспаборніцтва і ўдарніцтва непасрэдна ў калгасах, іменна саноўна-барскія адносіны да штодзённых запатрабаванняў калгаснікаў прывялі многія раёны да злачыннага адставання, да чорнай дошкі.

Вопыт перадавых раёнаў па апрацоўцы ільну яскрава даказаў, што кіраўніцтва ўсімі працэсамі апрацоўкі ільну непасрэдна ў калгасе, глыбокае веданне становішча ў кожным калгасе забяспечвае поспех барацьбы за лён.

Мы маем не мала выпадкаў пералежвання трасты на сцелішчах, што прыносіць агромаднейшыя страты дзяржаве, калгасам і калгаснікам. У Мсціслаўскім раёне нясвоечасовы пад'ём ільну са сцелішчаў, абыякавыя адносіны да гэтай важнейшай тэхнічнай культуры абышліся дзяржаве вельмі дорага. У шматлікіх пісьмах, паступіўшых у рэдакцыю, калгаснікі вусім правільна і законна абураны антыкалгаснымі, па сутнасці антыдзяржаўнымі, адносінамі многіх кіраўнікоў раёнаў, сельсоветаў і калгасаў да ільну.

Зусім зразумела, што партыя гэтага дапусціць не можа. У апошняй тэлеграме, пасланай раду раёнаў, Цэнтральны камітэт з усёй сур'ёзнасцю патрабаваў узмацнення кантроля на апрацоўцы ільну. Недабіткі класавага ворага скарыстоўваюць малейшае прытупленне пільнасці для сваёй шкодніцкай і падрыўной работы на гэтым рашаючым участку. Тут патрабуецца пільнасць, як ніколі.

БССР у гэтым годзе па тэмпах апрацоўкі і здачы ільну адстае ад мінулага году толькі таму, што ў радзе раёнаў нетаацаніліся цяжкасцей на фронце апрацоўкі і здачы ільну. Партыя будзе расцэньваць работу кіраўнікоў кожнага раёна, сельсовета і калгаса перш за ўсё па тым, як яны забяспечылі ажыццяўленне неаднаразовых рашэнняў партыі і ўраду аб ільне, як яны сумелі поўнасцю захаваць увесь ураджай ільну ад страт і ў які тэрмін, і якой якасцю лён апрацаван і здан пралетарскай дзяржаве.

Усебеларускі злёт майстроў ільну патрабаваў ад усіх калгасаў і калгасніц узняцця тэмпаў барацьбы за лён. У нас бясспрэчна маюцца ўсе ўмовы для паспяховага завяршэння ўсіх працэсаў апрацоўкі і здачы ільну. Неабходна толькі, каб да гэтай асноўнай і вядучай культуры сельскай гаспадаркі аднесліся так, як гэтага патрабуе партыя і ўрад. Патрабуецца толькі, каб кожны кіраўнік раёна, МТС, сельсовета і калгаса глыбока адчуваў адказнасць, ускладзеную на іх.

БССР абавязана рапартаваць партыі і ўраду аб датэрміновым і высокаякасным скончэнні і здачы ільну, аб новых перамогах на фронце барацьбы за заможнае і культурнае жыццё для ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

Высокая ўзнагарода — ордэн Леніна да гэтага абавязвае.

Майстры ільну

З кожным годам трапальшчыцы калгаса імя Тімірязева, Нейманцінскага сельсовета, павышаюць якасць ільновалакна.

У мінулым годзе калгас здаваў валакно 10—12 нумарамі, а ў гэтым годзе 14—16. Гэта дасягнута добрасумленнай работай калгаснiц. Лён у калгасе палюбілі ўсе, асабліва жанчыны. Кожны дзень з самай раніцы і да позняга вечара жанчыны заняты ільном. Калгасніцы робяць усё, каб марка іхняга ільну была самай вышэйшай у БССР.

Ільнотрапальная машына, якую пабудавалі самі калгаснікі, трапальшчыцамі выкарыстоўваецца з максімальнай нагрузкай. Яны ведаюць, што гэтым павысяць якасць ільновалакна. Работа на мяльна-трапальным пункце ідзе круглыя суткі.

На тропку ільну ў гэтым годзе вышлі нават і старухі, маючыя па сем дзесяткаў год за сваімі плячыма. 70-гадовая **Прасмыцкая** Варвара ўсіх калгаснікаў здзіўляе сваёй работай. Стоячы побач з маладымі за машынай, Варвара спрытна і лоўка бярэ жменьку за жменькай змятую трасту. Хутка і акуратна яна прасаджвае яе ў шчыліны трапальнай дошкі, паступаючы пад трапалы. Жменьку трасты яна трымае моцна ў руцэ, — гэта для таго, каб трапалы не вырывалі пасмы валакна. Час ад часу яна валакно растрэпвае, каб ні адна кастрынка не засталася ў валакне.

Прасмыцкая за рабочы дзень натропвае да 25 кгр. валакна. Валакно яе тропкі заўсёды здаюць 14—16 нумарамі.

Рэкорды па тропцы ільновалакна даюць таксама трапальшчыцы **Гарбачэўская** Мар'я, **Рагоўская** Марына, **Пашкевіч** Кацярына, **Пархубец** Аўдоцця, **Сайлевіч** Аляксандра і **Гарбачова Зінаіда,** якія вытропваюць за свой рабочы дзень па 20 кгр. валакна.

Трапальшчыцы — майстры ільну вывялі калгас у рады перадавых. Калгас займае першае месца ў раёне па ільнозагатоўках і па якасці здаваемага ільновалакна.

***

Будаўніцтва ільнотрапалкі сістэмы Санталава было скончана за 25 дзён. Яе будаваў лепшы калгаснік цесляр **Наваковіч** Сцяпан. У час работы ільнотрапалкі сабраліся ўсе калгаснікі і калгасніцы. Спачатку калгасніцы да машыны аднесліся недаверліва, баяліся яе. Калгасніца **Зайцава** Еўгенія казала:

— Боязна на ёй працаваць, яшчэ адарве руку гэта машына.

Распачалася масавая апрацоўка ільну. Пусцілі на поўны ход ільнотрапальную машыну. Аднаго дня работы ільнотрапальнай машыны было дастаткова для таго, каб усе трапальшчыцы упэўніліся ў яе карысці. З вялікай ахвотай зараз ідуць жанчыны на машынную тропку ільну.

Ужо ў 6 гадзін раніцы на мяльна-трапальным пункце вясёлае ажыўленне. Трапальшчыцы прыступаюць да работы. Кожны займае сваё месца. Пачынаецца ўдарная і вясёлая работа.

Ніхто дарэмна не траціць ні адной мінуткі.

— Дарэмна траціць час мы не хочам. Больш выпрацуем, больш і атрымаем на працадзень, — заяўляюць упэўнена трапальшчыцы.

І сапраўды, трапальшчыцы даюць высокую прадукцыйнасць. На машыне 8 трапальшчыц за рабочы дзень вытропваюць набела цэнтнер валакна, у той час, як з першых дзён работы вытропвалі толькі 36 кгр.

Лепшыя ўдарніцы **Зайцава** Еўгенія, **Чорчонак** Праскоўя, **Зайцава** Алена і другія вытропваюць начыста за дзень па 13—14 кгр., пры дзённай норме 11 кгр. Такім чынам яны зарабляюць па тры працадні. За ўдарную работу праўленне калгаса прэміравала іх па 20 руб. кожную.

Трапальшчыцы калгаса ўпэўнена ідуць да перамогі ва ўсебеларускім паходзе за лён імя тав. **Гікало.**

РАБАЯ ГАЛЯ.

Калгас «Маргойцы», Сенненскі раён.

ДАЁМ КРАІНЕ ШОУКАВІСТЫ ЛЁН

Звечарэла. Над зямлёй расцілаўся сівы туман. У цемры ледзь распазнаць чалавечыя постаці і толькі чуваць вясёлыя галасы ўдарніц. Гэта трапальшчыцы адна за другой нясуць на склад апрацаванае ільновалакно. Кожная з іх хутчэй імкнецца зважыць, а потым падлічвае кіло-нумары, кожная ганарыцца сваёй дзённай нормай выпрацоўкі.

Брыгадзір, прымаючы лён, сказаў:

— Лепшае ільновалакно атрымалася ў **Змітрачонак** Зіны. У яе 11—12 нумары, а таму яна заўтра павязе ільновалакно на прыёмачны пункт.

Гэта ўзнімала калгасніц. Кожная з іх абяцала выпрацаваць заўтра ільновалакна яшчэ больш і яшчэ лепшай якасці.

Аплата за кіло-нумары зацікавіла калгасніц у індывідуальнай здзельшчыне. Трапальшчыцы патрабавалі ад звяна па мяццю, каб перад закладкай у ільномялку сартаваць трасту па колеру і велічыні, не гледзячы на тое, што траста падбіралася пры церабленні.

У гэту веснавую сяўбу 43 га самай лепшай зямлі—па ініцыятыве калгасніц, была адведзена пад лён. Любаваліся калгасніцы паспяховым ростам свайго ільна. Яго буйныя галоўкі гаварылі аб ураджаі ільнонасення. Лепшая

ТРАПАЛЬШЧЫЦЫ АРШАНШЧЫНЫ

Аксіння Нікітава **Бацюкава** — дэлегат з ордэнаноснай рэспублікі. Яна сярод трапальшчыц суседняй з намі Заходняй вобласці, у прэзідыуме абласнога злёта. З ёю і яе суседка Вера Пятроўна **Кісялёва.**

З трыбуны злёта ад імя калгаснiц Беларусі тав. Бацюкава вітала майстроў ільнаводства. І не толькі вітала:

— Я крытыкавала на злёце выступленні ўсіх тых, хто таварыў, што лён не родзіць, што лён пагніў і здаюць дзяржаве нізкае валакно, — расказвае яна.

У Аксінні на гэта былі грунтоўныя падставы. 14 нумара валакно прывезла яна на злёт і не ніжэй гэтага нумара абавязалася здаць дзяржаве ўсё валакно да 5 кастрычніка. Яе словы — цвёрдыя, словы, выказаныя ад імя ўдарніц-трапальшчыц Аршаншчыны.

Пра курсы трапальшчыц, пра сартаванне траскі, пра еўні, пра вялікі прыбытак ад пасева ільну проста і праўдзіва расказала трапальшчыцам Заходняй вобласці т. Бацюкова. Сакратар Абкома ВКП(б) тав. Румянцаў горача вітаў беларускіх трапальшчыц, а Бацюкову ў прэзідыуме хваліў за добрую прамову.

Сямідзесяцігадовая трапальшчыца Кісялёва на злёце не выступала. Яна ў абедзены перапынак завязвала гутаркі з трапальшчыцамі Заходняй вобласці не толькі пра лён, але і пра ўсё жыццё калгаснікаў і працу жанчын.

Нашы майстры ільнаводства на злёце заявілі, што БССР у спаборніцтве з Заходняй вобласцю пяршынства не здасць.

***

Беднячку Бацюкаву вывеў у людзі калгас. Як лепшую ўдарніцу калгаснікі арцелі «Першае мая» абралі яе адказнай па ільну. Гэты абавязак яна выконвала з гонарам.

У мінулым годзе яна арганізавала жанчын-трапальшчыц на лепшую апрацоўку ільновалакна і калгас першым у раёне выканаў ільнозагатоўкі, здаў дзяржаве валакно 14—16 нумару з перавыкананнем на 3 цэнтн. Адказную па ільну два разы прэміравалі.

Суседні калгас «Чырвоны сцяг» быў у прарыве па выкананню дзяржаўных задач. Не хапала ў калгасе ільновалакна. Не рэдка былі выпадкі масавага крадзяжу калгаснага лабаа варожымі элементамі. Палітаддзел накіраваў Бацюкаву для ўмацавання гэтага калгаса. Абралі яе старшынёй.

На раённым злёце калгаснікаўударнікаў тав. Бацюкова заявіла: «Вопыт па ільну калгаса «Першага мая» я перанясу ў свой калгас».

Яна выклікала на спаборніцтва калгас «Першае мая», па пяршынства ў паходзе імя тав. Гікало за лён. І за адзін год калгас «Чырвоны сцяг» пад кіраўніцтвам Бацюкавай арганізацыйна акрэп і сёлета ідзе ў перадавых радах па ільнозагатоўках.

Аксіння ўнікае ва ўсе «дробязі» жыцця калгаса. Яна глядзіць за еўпямі, каб была нармальная тэмпература, сярэдняя вільготнасць. Баб не вострыя былі траналкі, каб трапальшчыцы добра сартавалі кожную жменьку валакна.

26 верасня калгасу «Чырвоны сцяг» уручылі дзяржаўны акт на вечнае карыстанне зямлёй. Прымаючы акт тав. Бацюкава заявіла:

— Мы даб'емся таго, што наша зямля будзе даваць не менш 20 цэнтнераў зярна з гектара, мы даб'емся, каб наша зямля красавала калгаснікам заможным жыц-

***

Вера Пятроўна **Кісялёва** — знатная трапальшчыца з калгаса «Парыжская комуна». 7 кілограм ільну 14—16 нумару штодзенна яна апрацоўвае. І не толькі на ільне яна ўдарніца. На жніве Кісялёва давала двайную норму выпрацоўкі, ёй штодзенна запісвалі 5 працадзён.

— За табой Пятроўна і адпачнуць нельга, — часта жартавалі маладыя калгасніцы над сваёй сяброўкай. І не гледзячы на семідзесяцігадовы ўзрост тав. Кісялёва штодзенна выходзіць на працу. І вось, як ні адгаварвалася яна, што старая, калгасніцы-трапальшчыцы паслалі яе дэлегатам на абласны злёт трапальшчыц у Смаленск.

Брыгада, дзе працуе Кісялёва скончыла апрацоўку ільну і здала дзяржаве валакно не ніжэй 16 нумару. На злёце ільновалакно калгаса «Парыжская комуна» атрымала пахвальную ацэнку.

Г. ЗАЙЦАЎ.

ДАЕМ КРАІНЕ ШОЎКАВІСТЫ ЛЁН (Працяг).

ўдарніца **Змітрачонак** Ліза гаворыць:

— Мы кожны год аддаем вялікую ўвагу ільну. І з года ў год займаем першае месца ў раёне па апрацоўцы і здачы дзяржаве ільнонасення і ільновалакна. Церабілі мы па 0,22 га ў дзень. Таму нам прадставілі месца на злёт лепшых трапальшчыц Заходняй вобласці, куды мы таксама паслалі лепшую з лепшых трапальшчыц — рэкардзістку (як называе яе старшыня калгаса і некаторыя раённыя арганізацыі), **Кліманскую** Таццяну.

Таццяна скромна расказвае аб

— Рукі ў мяне такія-ж, як і ва ўсіх калгасніц, але-ж з дзяцінства, калі я служыла ў кулакоў, гаспадыня за дрэнную апрацоўку ільну біла і выкручвала мне іх. Тады я працавала за страх. А зараз у сацыялістычнай гаспадарцы я працую за сумленне і таму лічуся лепшай ударніцай. Калі прыеду са злёта, вопыт Заходняй вобласці перанясу ў свой калгас.

— Сартаваць лён мы навучыліся ў калектыўнай гаспадарцы, — гавораць калгасніцы. Імкнемся даць дзяржаве лён, якога не бачыла старая дарэволюцыйная Расія.

За час апрацоўкі ільну значна выраслі рады ўдарніц. Да ліку лепшых належаць: **Аноша** Антаніна, **Кастусёва, Хрол** Домна. **Змітрачонак** Таццяна, **Клундук** Хадора, **Дзёмко** Тэкля, **Балотнік** Ганна і **Шункевіч** Ольга.

Лепельскі раён. **ЮЧКОВА.**

Тав. **Кісялёва.**
Фота Салавейчыка.

УБОРКА БУЛЬБЫ Ў РАЗГАРЫ

Разгарнулася масавая ўборка бульбы па ўсёй Беларускай рэспубліцы, разгарнулася яна і ў соўгасе імя Леніна, Смалявіцкага раёна. Соўгас засеяў 49 га бульбы і мяркуе ўбраць гэтую плошчу да 10 кастрычніка.

Да ўборкі бульбы соўгас падышоў падрыхтаваным. Дырэктар соўгаса — стары большэвік тав. **Баравік** улічыў 13-гадовы вопыт сваёй работы. Ён яшчэ з зімы 1934 года пачаў рыхтавацца да ўборкі бульбы. А пачаў ён з таго, што заключыў з калгасамі ўзаемныя дагаворы дапамогі адзін другому. Соўгас дапамагае калгасу апрацоўваць трактарамі глебу, дапамагае абмалаціць хлеб. За гэта калгасы ў часе копкі бульбы дапамагаюць рабочай сілай, у прыватнасці жаночай.

Калгасніцы калгаса імя Сталіна на чале з брыгадзірам **Стэфановіч** Надзяй паказваюць прыклады большэвіцкай работы на ўборцы. Добра працавалі маладыя ўдарніцы-калгасніцы **Шабан** Оля, **Жаромская** Наташа, **Крашэвіч** Анюта.

Не дрэнна працавалі і старыя работніцы соўгаса: **Кіліч** Кацярына, **Прылеская** Стася, **Кузьміцкая** Маня і **Шмелёва.** Яны даражаць соўгаскім дабром і прымушаюць другіх добрасумленна адносіцца да работы.

— Ураджай бульбы ў нас рэкордны. На пясчанай глебе атрымалі 1200 пудоў з гектара. Гэтая-ж бульба «Эпікур» на суглінках урадзіла да 1.000 пудоў з гектара.

За васьмігадзінны рабочы дзень 9—10 жанчын выбіраюць гектар бульбы. За 5 рабочых дзён яны ўбралі ўжо 13 га.

24 верасня да абеда працавала 12 жанчын і выбралі 0,70 га. У гэты-ж дзень пасля абеда 18 жанчын выбралі 1 га бульбы.

Чаму соўгас мае такія добрыя паказчыкі? Таму, што правільна расстаўлена рабочая сіла. Кожная жанчына працуе здзельна. Яна мае сваю норму. На 12 жанчын вылучаецца пара коней для разворвання бульбы. Уведзена канвеерная сістэма. Коні разворваюць барозны. Адразу-ж 6 жанчын становяцца і ўслед капаюць бульбу. Другія 6 ідуць насустрач. Пакуль яны выбяруць бульбу, конь вырые яшчэ баразну бульбы. Так пара коней увесь час працуе, падганяемая калгасніцамі. Кожнай жанчыне ўстаноўлены вехі і бачна—хто колькі выканаў.

На работу ў поле выходзяць з такім разлікам, каб пачаць у 8 гадзін раніцы. Напружана яны працуюць да 12 гадзін дня. Потым у соўгаснай сталоўцы іх чакае смачны абед з двух, а часамі з трох блюд. Абедзены перапынак цягнецца да 2 гадзін. А пасля яшчэ з большай энергіяй работаюць да 6 гадзін вечара.

Масава-выхаваўчая работа ў соўгасе не на апошнім месцы. Яе праводзіць дырэктар соўгаса тав. Баравік. Чытку газет праводзяць старыя соўгасныя рабочыя. Аднак, старшыня рабочага камітэта Карпаў яшчэ мала апіраецца на соўгасны актыў ды і сам мала праводзіць выхаваўчай работы сярод жанчын.

На 25 верасня соўгас ужо здаў звыш 50 проц. плана бульбапаставак. Робіць абмен высокасортнай бульбы «Эпікур» з суседнім калгасам «Перамога», «Чырвоны сцяг» і іншымі.

Пры ўмелым кіраўніцтве соўгас становіцца адным з першых у выкананні ўсіх гаспадарча-палітычных работ.

М. Ж.

Смалявічы.

НА КОПЦЫ

Калгас «Перадавік», Калодзіцкага сельсовета, 18 верасня распачаў масавую копку бульбы.

Брыгада № 1 — упераддзе. Лепшыя ўдарніцы **Ладуцька** Кацярына Захарава, **Ільмоўская** Вера выбіраюць да 0,08 га бульбы ў дзень пры норме 0,04. Добра працуюць яны. Чыста, акуратна выбіраюць, не пакідаюць ні адной бульбінкі ў зямлі.

У першыя дні копкі мы здалі дзяржаве 6 тон бульбы. А праз некалькі дзён поўнасцю разлічыліся па бульбапастаўках.

Старшыня калгаса ІЛЬМОЎСКІ.

Чэрвеньскі раён.

ЛІШКІ—ДЗЯРЖАВЕ

Калгас «Новае жыццё» першым у Святцкім сельсавеце скончыў уборку азімых і яравых культур. Ён па-ўдарнаму спалучыў уборку з малацьбой і выкананнем абавязкаў перад дзяржавай.

На хутчэйшае выкананне збожжапаставак дзяржаве паміж брыгадамі разгарнулася сапраўды большэвіцкае спаборніцтва. Пяршынства ў здачы збожжа атрымала другая брыгада, за што прэміравалася ў суме 100 рублёў.

На 25 жніўня калгас скончыў збожжапастаўкі і разлічыўся за натураплату з МТС. Поўнасцю засыпан насенна-страхавы фонд. Не адстаў калгас і ў бульбапастаўках. На 22 верасня скончана здача бульбы дзяржаве, не гледзячы на тое, што копка бульбы яшчэ не скончана.

Не здае калгас пяршынства і ў продажы дзяржаве збожжа. Калгаснікі аднагалосна парашылі прадаць 14 з паловай тон збожжа. На суправаджэнне гэтага абозу права прадастаўлена толькі лепшым ударніцам, такім, як **Анашына** Антаніна, **Махоціна** Ольга і другія.

Радасныя твары калгаснікаў гаварылі аб вялікай адданасці іх і любві да сваёй дзяржавы.

М.

Лепельскі раён.

Гурская Хіма — лепшая ўдарніца—трапальшчыца калгаса «Парыжская комуна», Аршанскага раёна.
Фото Я. Салавейчыка.

НА СВІНАФЕРМЕ

Загадчык свінафермы калгаса «Палітаддзелец» тав. **Хайкін** дужа заклапочаны сёння. Усю ноч ён не спаў. Усю ноч правёў на свінарніку. У гэту ноч было два апаросы: Ці-ж можа спаць у такі час загадчык фермы?

Раніцой Хайкін заходзіць у свінарнік і не нацешыцца бялюсенькімі парасяткамі, якія поўкругам ляжаць каля свінаматкі і сасуць.

Ёсць чаму радавацца тав. Хайкіну. За 6 месяцаў яго работы ферма ўкамплектавана пародзістымі свінямі. Ферма амаль не ведае адыходу маладняка.

У свінарніку чыстата. Свінні ўтрымліваюцца на ўсіх правілах санітарыі. Пасля кожнага кармлення карыты чыста вымываюцца.

Для работы на свінаферме падабраны лепшыя, праверапыя людзі калгаса. Тав. Хайкін быў ініцыятарам увядзення індывідуальнай здзельшчыны. Гэта яшчэ больш зацікавіла калгаснік.

Парфіновіч Яніна сваёй ўзорнай работай служыць прыкладам для другіх. Гэта чалавек, бязмерна адданы соцыялістычнай вытворчасці. Тры гады Яніна працавала ў соўгасе «Пачаевічы» і адтуль перанесла ў калгас лепшыя вопыты работы.

Два гады ўжо працуе Яніна Парфіновіч ў калгасе «Палітаддзелец». У гэтым годзе яна была на паўтарамесячных курсах па свінагадоўлі і ўсе набытыя веды прымяняе на практыцы. Даглядае яна 8 пародзістых матак, маладняк ад іх і аднаго вытворніка. Яе свінні заўсёды ў лепшым стане, бо яна беражэ іх, як зяніцу вока. Таму ўсе яны добрай упітанасці.

Аднойчы, калі Яніна была выходнай, а загадчык фермы адсутнічаў, здарыўся вышадак — у адной з свіней пайшла кроў з носа. Яніна, даведаўшыся аб гэтым, забегла, прыклала кашэс з ільдом, прасядзела ўсю ноч і адратавала свінню. Цікава, што гэта свіння прымацавана нават не да яе, а да другой свінаркі.

Быў і другі факт — ў свінаматкі зацвярдзела вымя. Яна корчылася ў жудасных болях і не магла карміць парасят. Усе думалі, што трэба ўжо парасят раздаць другім свінаматкам, а свінню—на мяса. Парфіновіч і тут знайшла выйсце. Адразу дастала камфорнае масла і

Тав. Парфіновіч.

пачала расціраць вымя. Так яна лячыла свінню тры дні, выратавала яе і зберагла ўвесь прыплод.

Ударная работа Яніны Парфіновіч ацэньваецца. Яна вылучана РайЗА для прэміравання.

Не адстае ад Яніны і другая свінарка — **Шарлай** Марыля. На ферме працуе яна пяць год. Даглядае 10 свінаматак, якія добра ўпітаны.

Любіць Марыля сваю работу. У час апаросу яна ўсю ноч праседжвае ў свінарніку. Уважліва даглядае кожнага парасёнка. За ўдарную работу праўленне калгаса прэміравала Марылю кабанчыкам.

Цяпер свінаферма рыхтуецца да зімы. Свінарнік ацеплен, зроблены печкі, пракладваецца падлога на ўсяму свінарніку.

Н.

Чашніцкі раён.

ЛЕПШАЯ СВІНАРКА

Тарасевіч Наста — лепшая даглядчыца свіншатаварнай фермы калгаса «Чырвоная гара», Сенненскага раёна.

Яшчэ цёмна, а Наста ўжо на свінарніку. 50 свіней, якіх яна даглядае, — лепшыя на ферме. За час работы ў Насты не было ні аднаго выпадку падзяжа.

Наста любіць сваю работу і гонарыцца ёю. За жнівень месяц яна выпрацавала 37 працадзён

За ўдарную работу праўленне калгаса прэміравала Насту Тарасевіч парасёнкам.

Г. РАБАЯ.

ДЗВЕ ТАВАРЫШКІ

Прыгожыя, слаўныя дзяўчаткі! Маладыя курносыя твары. Жвавыя, бліскучыя вочы.

Адна — Ольга Жылюк — поўная, гарэзлівая дзяўчынка. 16 год ёй. Другая — Ліза Захарчэнка — гнуткая, стройная. Ёй 18 год.

А як падобны яны!

— У чым-жа падабенства? — запытаецеся вы.

Вось у гэтым вясёлым выразе твараў, ў іскрыстых вачах, у жыццерадаснай дзелавітасці.

А спраў у абодвых многа. Два гады работаюць яны. І работаюць вельмі добра.

Ольга — свінарка. 20 парасят даглядае яна. Ні аднаго выпадку падзяжа не было ў яе. А Ліза — цялятніца. Ёй даручылі 25 цялят.

— Значыцца не дрэнна працую, калі коўдрай прэміравалі, — гаворыць яна, іграючы ўсмешкай і белымі зубамі.

Праца для іх — радасць. Гэта відаць па ўсяму выгляду дзяўчатак, на кожнаму слову, сказанаму імі.

— Мы абедзве вельмі вучыцца жадаем. Вось навучымся, можа на другую работу пашле комсамол. Мы-ж хутка комсамолкамі станем, заяву падалі, — дадаюць яны ўрачыста.

— А пакуда будзе з парасяткамі разлучацца, — нечакана нахмурыўшыся гаворыць Ольга. — Яны такія ласкавыя, паслухмяныя!

І зноў яркі бляск у вачах, і зноў радасная ўсмешка на дзіцячых пухкіх вуснах.

Аб стомленасці ад работы не можа быць і гутаркі. Увечары — агонні агляд маладых выхаванцаў і бягом да дому. Хутка трэба пераапрануцца ў прыгожае, чыстае адзенне і таксама хутка — ў клуб.

Там вельмі весела. Так ярка гараць электрычныя лямпачкі, так добра грае гарманіст **Кароль**, і танцы і песні, і песні і танцы.

І толькі тады, стаміўшыся, калі сціхае музыка, дзяўчаткі, абняўшыся і напяваючы, ідуць дамоў, у чыста прыбраныя хаты, павольна распранаюцца і тушаць электрычнасць, каб заўтра таксама радасна пачаць новы працоўны дзень.

С.

Ельскі раён, калгас «X з'езд советаў».

НАВЕЧНА

А. МАНЬКОУ

Святочны выгляд мела ў гэты дзень калгасная вуліца, выбрукаваная гранітам. Чыста падмецепая і пасыпаная жоўтым пясочкам, яна чакала мноства гасцей. Ветліва хіліліся пасаджаныя з абодвых бакоў ёлкі і чырвоныя сцяжкі на іх.

Чырванню плакатаў і сцягаў расцвіла калгасная вёска.

Дамы калгаснікаў упрыгожаны партрэтамі правадыроў партыі і ўраду. Высокія аркі, трыбуна і свіран, у якім сёння будзе калгасны банкет у гонар вялікага свята, старанна ўбралі жанчыны. Меню абеда было сур'ёзна абгаворана. Для прыгатавання яго калгаснікі вылучылі лепшых кухарак, якія калісьці санам рыхтавалі абеды. Усю ноч не спалі **Гулевіч** Фаня, **Давідовіч** Антаніна, **Давідовіч** Марыя, **Барэйка** Шура, рыхтуючы святочны абед. Апетытна дымілася свежае мяса быка і чатырох бараноў, зарэзаных спецыяльна для гэтага дня.

Прачнулася вёска раней звычайнага. Кожны заканчваў уборку ў сваім доме. А падрыхтаваліся да свята вельмі добра.

Утульна ў кватэры **Бурбоўскага** Алеся — былога панскага батрака. Выбелены печы, выклеены сцены, чыста вымыты падлогі. Дочкі Таня і Аня хутка апранаючыся, запелі песню з марша «Вясёлыя рэбята».

Стары Алесь у вельмі добрым настроі. Новы гарнітур, начышчаны боты, маладыя галасы і бадзёрая песня. Добра! Яму нават самому хацелася бы далучыцца да дзяўчат і разам з імі спяваць аб шчасці. Але ён не адважваецца, дочкі засмяюць старога.

Прыбіраючы хату, накрываючы новым абрусам стол, запела і старая Ганна. А тады і Алесь не вытрымаў і зацягнуў:

«Мы молодые хозяева земли»...

Задорныя комсамольскія песні неслісся і з вуліцы. Дзяўчаты, хлопцы з кветкамі, гармонікам сустракалі гасцей з калгасаў, з раёна, з Менска, ад Чырвонай арміі.

Госці прыязджалі на машынах, на лепшых конях, а з суседніх калгасаў прышлі арганізавана з чырвонымі сцягамі.

Прыехалі ў госці і сваякі.

У інспектара па якасці Якава Мартынавіча **Драгуна** 4 зяці. Трое з іх ў той дзень прыехалі да яго. За снеданнем вялі гарачую гутарку. Якаў даказваў, што патрэбна зрабіць, каб атрымаць 110. пудоў ячменя, 100 пудоў пшаніцы і 70 пудоў жыта з гектара.

— Ты, татка, у нас сапраўдны аграном, — уважліва гаварылі зяці.

Усміхнуўся дзед:

— На вопыце, дзеці, даказаў. У нас і са ільном добрая справа. Мы яго не ніжэй шаснаццатага нумару здаём.

—Але чаму чацверты зяць — Сёмка Навіцкі не прыехаў?

— Я яго не прасіў, за ім дачка мая не жыве, а мучыцца. Не слухае ён нікога, у калгас не ідзе. Не хачу больш з ім гаварыць. Гэта выраўак з усіх беднякоў.

На хвіліну нахмурыўся дзед.

***

... Перад аркай спыніўся лётчык камандзір-лейтэнант у параднай форме. Вялікімі літарамі напісана: «Сёння наш калгас атрымае дзяржаўны акт на вечнае карыстанне зямлёй. 514,41 га зямлі дзяржава аддае нам дармова»...

Прачытаў і пашоў далей. А насустрач старая Стэфаніда Адамаўна **Маслава.** На руках у яе ўнучка — маленькая дзяўчынка. Не глядзіць Стэфаніда на твар летчыка. Яна спыніла свой погляд на прыгожай вопратцы лётчыка.

— Віншую, мама, з вялікім святам!

Нават спалохалася, але тут-жа радасць засвяцілася ў яе вачах.

— Я-ж цябе не пазнала, сынок ты мой! Адкуль-жа ты звалiўся?

— З совецкай планеты, — усміхаючыся адказаў Ваня **Маслаў.** У вас сёння свята вялікае, не пазнаць вёску.

Да смерці не забудзе Стэфаніда гэтай размовы. Кожны расказваў аб сабе: сын аб ударнай сваёй рабоце і жыцці, старыя—аб новым калгасным ладзе. Успомнілі і мінулае.

Сымон **Маслаў**—муж Стэфаніды калісьці злым ворагам лічыў свайго суседа Івана Маслава. Біліся яны на мяжы ў полі, біліся і дома, ніяк не маглі падзяліць вузенькую палоску зямлі.

Так было не толькі ў гэтай сям'і.

Барэйка Рыгор ўсё жыццё злаваў на свайго брата Саўку за зям-

А насустрач СТЭФАНІДА МАСЛАВА з унучкай.

Фота Курсевіча.

лю. **Гілевіч** Марка паламаў рэбры свайму суседу **Маўчану. Владыко** Павел надоўга паклаў у пасцель, ударам таўкача, свайго брата Івана.

Жылі людзі ў брудных хібарках без падлогі. Мыліся два разы ў жыцці: як нарадзіцца і калі памрэ. А гора сваё залівалі ў карчме барона Рудляна.

Моцна трымаў барон сялян у сваіх руках. У адным канцы вёскі—карчма, а ў другім—царква, а з бакоў — зямля барона.

Цяжка было дыхаць. Людзі стагоддзямі марылі аб кавалачку зямлі, шукалі яе і не маглі знайсці.

Шмат крыві праліта за зямлю. На фоне чорных успамінаў яшчэ яскравей паўстае сённяшні дзень.

Да рэволюцыі ў Слабадзе на кожны двор (сюды ўваходзіла і зямля кулакоў) прыпадала ў сярэднім 3 га зямлі. Валавы збор зернавых не перавышаў 60 пудоў. А цяпер на кожны калгасны двор прыпадае 9 га зямлі, а валавы збор зернавых ровен 5 тонам.

Раней жанчыны дзяцей раджалі на панскім полі, а цяпер калгасніца па статуту атрымоўвае водпуск да і пасля радоў.

Раней цэлы дзень жала маці ў полі, а яе малое дзіця заходзілася ад плачу ў калысцы, надвешанай на цапках. У калысцы часта заводзіліся чэрві, бо не было матцы часу за дзіцём глядзець. А цяпер? Цяпер дзеці калгасніц добра дагледжаны ў дзіцячых яслях. Сапраўднае чалавечае жыццё знайшло працоўнае сяляства ў калгасе!

Калгаснікі не патрабуюць авансам хлеба. У іх многа мінулагодняга.

Калгаснікі прагналі барона Рудляна, зламалі супраціўленне кулакоў і будуюць сваю светлую будучыню.

Ёсць тут і ленінскі куток, і прыгожая школа. Страшна нават успомніць, што да рэволюцыі ў вёсцы было толькі чатыры граматных.

Пабудавана канюшня, свіран. будуецца цагельны завод.

У калгасе добрая малочна-таварная ферма. Ёсць 78 штук буйнай рагатай жывёлы, 28 авечак, 12 свіней.

Сёння на ўрачыстым сходзе першае слова лепшым даяркам, даглядчыцам: **Барэйка** Надзі, **Бурбоўскай** Каці, **Маўчан** Марусі. У іх усе каровы ацяліліся і вышлі на вясну ў сярэдняй сытасці. Не было ў іх і адыходу маладняка.

Вось чаму квітнеюць усмешкі калгаснікаў і калгасніц у дзень вялікага свята — уручэння дзяржаўнага акта на вечнае карыстанне зямлёй.

На трыбуну падняўся старшыня калгаса «Іскра» Васіль Васільевіч **Барзйка.** Адчыняючы ўрачысты сход, ён расказаў аб чорным мінулым і шчаслівым сучасным вёскі Слабады.

З натоўпу прагучэў лозунг: «Няхай жыве комуністычная партыя і наш родны, усімі любімы першы калгаснік тав. Сталін!» Доўга не змаўкаюць гукі «ўра».

Пад бурныя воплескі сход абраў у ганаровы прэзідыум таварыша **Сталіна** і ўсіх членаў Палітбюро, сардэчна павіталі нашай рэспублікі **тт. Гікало** і **Галадзеда**, правадыра Германскай компартыі тав. **Тэльмана**, сакратара ЦК компартыі Польшчы тав. **Ленскага.**

Стары **Маслаў** Сымон папрасіў слова.

— Правадыру, нашаму роднаму **Сталіну** вялікае, як ён сам, падзяка за зямлю, за добрае жыццё! Я прашаную абраць ганаровым старшынёй нашага схода вялікага **Сталіна!..**

Прапанова была прынята пад бурныя апладысменты і крыкі «ўра».

У прэзідыуме: тав. **Кавальчук**— член бюро ЦК КП(б)Б, намеснік наркома земляробства — тав. **Каранеўскі**, ад Чырвонай арміі—тт. **Грыгор'еў** і **Шмідт**, лепшыя калгаснікі і калгасніцы.

Урачыста прывітаў старшыня Лагойскага РВК тав. **Клімаў** калгаснікаў з вялікім святам. З напружаннем сачылі ўсе за тым, як ён раскрыў сіні канверт і дастаў кнігу ў прыгожай з залатымі літарамі вокладцы.

У гэтай кнізе — план з указаннем граніц зямлі калгаса. Гэта кніга кладзе канец спадвечнаму голаду на зямлю. З захапленнем узяў яе ў рукі старшыня калгаса Васіль Васільевіч.

З атрыманнем акта на вечнае карыстанне зямлёй, калгаснікаў віталі: т.т. **Кавальчук, Каранеўскі, Грыгор'еў** і іншыя.

Адказаць на прывітанне вышаў калгасны каваль **Маслаў:**

— Я дзякую нашай ленінскай партыі, лепшаму чалавеку нашай вялікай краіны тав. **Сталіну** ад імя ўсіх калгаснікаў за зямлю, за прыгожае жыццё. Мне ўжо каля 70 год, а я такой радасці не бачыў як сёння. Майго дзеда барон Рудляп абмяняў у Курскай губерні на сабаку. Горш чым панскія сабакі жылі мы. А цяпер мой сын— камандзір-лётчык. Пяць камандзіраў вышла з нашай вёскі, ды яшчэ 9 чалавек вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, інжынерамі будуць... Таму я і прапашую напісаць тав. **Сталіну** пісьмо аб мінулым і сучасным нашай вёскі і аб тым, што атрыманую зямлю мы шікому не аддадзім...

...Сонца схілялася на захад. Калгаснікі і госці ішлі на калгасны банкет. А пасля абеда пачаліся танцы і гульні ў кватэрах калгаснікаў.

Толькі ў 12 гадзін пачалі разъязджацца госці.

Слабодскі сельсовет,
Лагойскі раён.

АНІКА

У Анікі чорныя бровы,
А вочы, як спелыя вішні.
Знаёмы ім поле, дубровы
І ў ветрах халодных узвышшы.
Знаёмы агні залатыя
Ля шэрых падраных шатроў.
Вясёлыя дні маладыя
Згаралі ля гэтых кастроў.
Па пыльных дарогах не мала
Рассыпана ў роспачы слёз
Па вёсках на картах гадала,
Дзяўчатам прадсказвала лёс.
Жыццё на калёсах сурова
Спрадвеку спраўляла свой крут.
Але ападалі дубровы.
Касцёр за ракою патух.
У далеч глядзелі цыгане,
Як вецер разносіў вуглі,
Як дочка іх сонечным раннем
Ішла адпукоўваць зямлю.
І шчасце ўсміхнулася блізка,
Цыганка аб ім заспявала.
Сягоння ў палях трактарысткай
Чарнявая Аніка стала.
Як крыллі падняліся бровы,
Знаёмы к ёй табар прышоў,
Пакінуў ён гоман сасновы
І беднасць, цыганскіх шатроў.
Смяяліся ўсе нібы дзеці
І макам іх вусны цвілі, —
Бо толькі цяпер яны ў свеце
І шчасце і радасць знайшлі.

ВАСІЛЬ НЁМАН.

Шчасліва

— Не застануся, ні ў якім разе! Ніякія ўгаворы не дапамаглі.

— Умацаванне здароўя пасля лячэння — справа бясконцая. Цяпер я здарова і паеду дадому.

Не ўсім яе довады здаваліся сур'ёзнымі. Дакаралі яе ўсе знаёмыя па санаторыі. Асабліва востра жартавала над ёй **Савіцкая** — студэнтка КІЖ'а БССР.

— Прызнайся, Шура, проста засумавала па сваім Ванечке. Штодзённых пісем ужо мала, хочацца да яго хутчэй палящець.

— Ну, і засумавала! — апрыталася **Токарава.**

І Савіцкая, якая з першай-жа сустрэчы на Менскім вакзале здалася Шуры такой прывабнай і такой адукаванай, на мінуту губляла сваё хараство.

Довады ў Шуры былі вельмі пераканаўчымі. Калі хварэеш, зразумела, не да пяшчотнасцей. Трэба ехаць, куды дактары пасылаюць, трэба зрабіць усё, каб стаць зноў такой-жа працаздольнай, жыццерадаснай комсамолкай, якой ведаюць яе ўсе на фабрыцы імя Крупскай. Вось і паехала, хоць і тады хвалявала яе думка аб разлуцы з Ваняй.

Але цяпер ёй доктар Панасевіч дарма прапаноўвае прадоўжыць пушчёўку. Адчувае яна сябе зусім здаровай, і ёй вельмі хочацца дадому. Такі сум у апошнія дні, нікому нават не раскажаш.

Хвалюе яе і дзіцё ўнутры. Яно-ж прыкметна расце цяпер. Кожнай раніцой абмацвае яна свой жывот і напружана прыслухоўваецца да гэтага таямнічага ўнутранага жыцця.

Так многа думак ад гэтага, а Вані няма. У пісьме — ці многа напішаш? Ды і няёмка як-та пісаць аб гэтым. А калі ён быў-бы тут, усё можна-бы расказаць яму: і аб невялічкіх хваляваннях зараз, і аб вялікіх радасцях уперадзе.

Ды і ён сабе там месца не знаходзіць. Прыдзе з завода дадому (а ён адзін з лепшых слесароў на заводзе імя Варашылава, і актыўны комсамолец, і на рабфаку вучыцца) і чытае ўвесь вечар да глыбокай ночы.

Вось і парашыла Шура. Дагаварылася з Савіцкай і назад ехаць разам.

Шумлівая мітусня ахапіла Шуру. Адразу безліч клапот. І падарунак Вані знайсці трэба, і фруктаў каўказскіх накупіць яму і таварышкам сваім — комсамолкам, і білет на чыгунку заказаць і нарэшце чэмадан свой скласці.

Завярцелася, замітусілася Шура, нават стамілася ад усіх гэтых клапот. З вялікай радасцю села ў вагон. Але і тут патрэбна было ўладжвацца, рэчы раскласці. Дапамагала ў гэтым і Савіцкая.

— Як дома! — сказала яна. — Каб і ўтульна, і прыемна было.

Нарэшце ўсё ў парадку. Можна легчы і адпачыць.

Леціш за музыку ў Есентукскім парку здаваўся ёй стук калёс. Пад яго і паснаць можна, а думаць у такт яму яшчэ прыемней. Каб ніхто не перашкаджаў гутаркамі, леціш зачыніць вочы і прыкінуцца заснуўшай.

— Вось гэта называецца марыць, — пранеслася іранічная думка.

Але лятуценны настрой сапраўды ахапіў Шуру. Кожны ведае такі стан,

калі цяжка адрозніць сон ад думак, калі ў мазгу змяняюцца сотні вобразаў, малюнкаў, калі ўспаміны натоўпамі рояцца ў галаве і прымушаюць вас то моцна хмурыць бровы над зачыненымі вачыма, то ўсміхацца адным толькі вуснамі.

Так думалася і Шуры. Вось прывабны твар **Зарэцкай** — сакратара комсамольскага камітэта іх фабрыкі, якая так часта прыходзіла да яе ў час хваробы.

А вось і дзяўчаты са значкамі «ГПО». А яна так і не здала плавання, перашкодзіла хвароба, а цяпер — цяжарнасць. Гэты значок носіць і Ваня. Ну, ён такі моцны!

А вось і развітанне з Ваняй. Затое зараз яна едзе да яго здаровая і вясёлая.

Непрыемныя толькі ўспаміны аб тым, якой злюкай была яна ў час хваробы. І чаму яна чапялася да яго?! Усё нервавала яе, тэмпература, мабыць, рабіла яе такой. А ён, які-ж ён добры! І ў палітвучобе дапамагаў не адставаць, і газеты, і кнігі кожны дзень прыносіў. А бывала пачне яна «бузіць» па якой-небудзь дробязі, а ён в усмешкай слыніць яе: —

ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІЦЫ ФАБРЫКІ ІМЯ КРУПСКАЙ: інструктар ленты лепшая ўдарніца

СУСТРЭЧА

— Давай, Шурачка, заўтра аб гэтым пагутарым.

Зразумела, што назаўтра яна сама бачыць, што ўсё гэта глушства, што любяць яны адзін аднаго моцна.

Як маці хадзіў ён за ёй у час хваробы, — думала Шура. — І прыгадалася раптам пяшчотная любоў маці.

Гэта было, здаецца, так даўно. Толькі кавалкі ўспамінаў ўсплываюць у памяці. Самай маленькай была яна ў сям'і. Год мінуў ёй, калі бацька памёр. А сям'я вялікая. А жыць да калгаса не было на што. Адзін толькі брат — шахцёр дапамагаў.

Шура дужа любіць брата. Цяпер ён у Маскве, на заводзе, дзе самалёты робяць. І на рабфаку вучыцца. Яна таксама будзе далей вучыцца, як ён і Ваня. Толькі чатыры класы скончыла яна. Мала гэта, вельмі мала. Параіцца трэба з братам, куды паступаць ёй цяпер.

Вось-бы прыехаць яму, паглядзець, як яны з Ваняй жывуць, працуюць, вучацца. Цяпер і пачаставаць ёсць чым. Жывуць яны прыпяваючы. Не менш 250 руб. у Вані, ды і ў яе (яна цяпер інструктар ленты), 200 — 225 руб. — куды-ж ім больш. А прэмій! Абодва-ж яны працуюць не дрэнна, асабліва ён, Ваня, — думае Шура.

Адно дрэнна: пакой адзін, але хутка будзе і другі. Старшыня жакта ўжо падабраў кватэрку з двух пакояў.

Гэта ўжо для маленькага—і радасная хваля захлынула Шуру.

Але Савіцкай сумна.

— Уставай, соня, час есці. Паспееш уначы выспацца.

Давялюся ўстаць. Але ўсмешка ўжо не зыходзіла ўсю дарогу з ружовага твару.

І толькі, калі пачалі пад'язджаць да Менска, зноў пачаліся хваляванні. А можа не сустрэне, а можа тэлеграму не атрымаў?!

— Нічога, усё ў парадку будзе. Прыдзе, сустрэне цябе Вашечка, — заспакойвала яе Савіцкая.

Але сэрца не супімалася. Хутчэй-бы, хутчэй..

— Менск, — абвясціў кандуктар.

А Шура даўно гатова. Даўно завязаў чэмадан, атледжаны грушы (яны так хутка псуюцца). І пальто ўжо на руцэ. Загадзя стала яна ў тамбуры. Першай хочацца зыйсці з цягніка.

І ўсё-ж нечаканым паказаўся далёку горад і чыгуначныя будынкі. У змроку вялікім і ўрачыстым выглядаў вакзал. Непазнавальнай была плацформа.

Ваша! Ці ён? Ён, ён! Саскочыць-бы, саскочыць на-хаду.

А вось і ён пазнаў яе і пабег хутчэй за цягніком.

— Здарова!

— Здарова!

— Мілы!..

— Слаўная мая! Як ты загарэла, Шурык, якая прыгожая!

— Знайшоў красуню. Вось ты сапраўды малайчына ў новым касцюме і кашулі з тальштукам.

Прахожыя ветліва аглядалі гэту шчасліву пару.

С. ЧОРНАЯ.

Фото КУРСЕВІЧА.



Шура ТОКАРАВА; начальнік 1-га цэха тав. РАГОЗІНА; пам. начальніка 1-га цэха тав. АНІХОЎСКАЯ; тав. ЗАВАЛЕЕВА; майстар ленты 3-га цэха тав. КАПТАН.

НАШЫ ПОСПЕХІ

Набліжаецца 18 гадавіна Окцябрскай рэволюцыі, у падрыхтоўцы да якой рабочы клас і калгаснае сялянства Совецкага Саюза шадагульняюць грандыёзныя поспехі нашага росту. Поспехі нашай краіны як у люстэрцы адбіваюцца на поспехах нашай фабрыкі.

Фабрыка існуе з 1930 года. Пачалі працаваць пры 22 работніцах. Зарплата была вельмі нізкая, зусім не было бытавых устаноў, якія-б абслугоўвалі работніц. З-за недахопу кватэр некаторыя работніцы працавалі па дзве змены.

Бічом фабрыкі была цякучасць рабочай сілы. Стаялі дзве чаргі: адна на звальненне, другая — на прыём. Фабрыка з года ў год не выконвала промфінплан.

Толькі ў пачатку 1935 года мы пачалі выконваць промфінплан. Дзевяцімесячны план на 24 верасня выкананы на 100,6 проц.

Цяпер фабрыка налічвае 916 рабочых, з іх 791 — работніца. Старых работніц — 364 чалавекі. Сярод іх мы маем вялікі актыў. Толькі адных рабкорак налічваецца 80 чалавек. Ударніц 448 чалавек. Дзяржтэхвучобай ахоплена 200 чалавек.

Зараз фабрыка мае сталоўку, яслі, дзіцячы сад, медпункт, інтэрнат на 120 чалавек. Пабудован новы інтэрнат на 150 чалавек.

Наша соцыялістычная фабрыка за пяць год свайго існавання выхавала новых людзей. Вось тав. **Голубева** — працуе ў нас з 1931 года. Прышла яна на фабрыку непісьменнай, без кваліфікацыі. Зараз тав. Голубева — лепшая ўдарніца, некалькі разоў прэміравана не толькі за добрую работу ў цэху, але і за культурнасць у быту. Яна член ЛКСМБ, вучыцца ў школе.

Тав. **Токарава** — у мінулым калгасніца. У 1931 г. паступіла на фабрыку. Зараз — яна лепшая ўдарніца, некалькі разоў прэміравана, член ЛКСМБ, вылучана інструктарам ленты.

Тав. **Рагозіна** — на фабрыку паступіла, не маючы адпаведнай кваліфікацыі. Працавала спачатку работніцай, потым інструктарам, майстрам цэха, а зараз яна начальнік цэха.

Такія работніцы, як **Завалеева, Зелікман, Вітушка** нарадзіліся разам з вялікай Окцябрскай рэволюцыяй. Яны з'яўляюцца лепшымі ўдарніцамі, фізкультурніцамі. Авладалі тэхнікай на выдатна. Акрамя іх многа работніц перасунуты ў нас на вышэйшыя разрады.

На аснове ажыццяўлення прамовы тав. **Сталіна,** кіраўніцтва фабрыкі вылучыла некалькі работніц на кіруючую работу. Тав. **Аніхоўская** з інструктара стала зменным майстрам. З работай спраўляецца. Яе змена сістэматычна выконвае промфінплан і вядзе барацьбу за добраякасны выпуск прадукцыі. Таварышы **Верніковская, Тарасевіч, Анцылевіч Калтан, Токарава, Мабовіч, Златаронак, Котляр** і іншыя вылучаны інструктарамі.

Намечаны да вылучэння пасля здачы дзяржтэхэкзамена яшчэ шмат работніц у якасці абмельшчыц, вышывальшчыц, рэзакоў інш.

Але заспакойвацца на дасягнутым нам нельга. У нас яшчэ ёсць шмат недахопаў, якія перашкаджаюць у рабоце: недастатковы ўзровень вытворчай дысцыпліны, слаба арганізавана соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Таксама слаба праводзіцца ў нас і падрыхтоўка да здачы дзяржтэхэкзамена.

Калектыў фабрыкі зрабіў першыя крокі, каб ператварыць наша прадпрыемства ў перадавое, якое апраўдвала-б назву фабрыкі імя **Крупскай.**

Сакратар парткома менскай швэйнай фабрыкі імя Крупскай.
ШУСЭР.

ВЫЛУЧАЕМ РАБОТНІЦ

Абутковая фабрыка імя Кагановіча, арганізаваная ў 1924 г., развіваецца і пашыраецца. У 1924 г. на фабрыцы працавала толькі 150 чалавек, а жанчын-работніц налічваліся адзінкі, прычым выконвалі яны толькі падсобныя работы.

4—5 гадоў назад пачалося вылучэнне работніц на больш кваліфікаваныя работы. Спачатку дужа моцна давалі сябе адчуваць старыя традыцыі ў тым, што «абутковая прамысловасць не прыстасавана для жаночай працы».

Адпак, вопыт работы жанчын даказаў няправільнасць гэтых думак. Жанчына-работніца працуе не толькі не горш за мужчыну, але часта — лепш.

У сучасны момант колькасць жанчын-работніц даходзіць да 650 чалавек і складае 54,5 проц. усіх рабочых фабрыкі.

Сярод работніц ёсць ужо не малая колькасць закройшчыц, прашыўшчыц, накладчыкаў падэшвы. З дзесяці рубшчыкаў полувала — пяць з'яўляюцца жанчынамі.

На вядучым працэсе «раскрой» працуюць 15 жанчын. Маюцца жанчыны-кантралёры якасці ў штамповачным цэху. Рубшчыцы **Пашэвіч, Савіцкая, Лабейка, Клімовіч** з'яўляюцца адпымі з лепшых у цэху. Яны перавыконваюць нормы выпрацоўкі на 15—20 проц., а за эканомію дэфіцытнага полувала яны атрымоўваюць прэміі, якія даходзяць да 20 проц. іхняй зарплаты.

Закройшчыцы: **Шац, Аляксеева, Паўлава, Чарапахіна, Добкіна** перавыконваюць нормы ад 5 да 30 проц. пры значна меншай колькасці браку, чым гэта дапускаецца.

Ёсць на фабрыцы жанчыны-майстры (**Шырко** ў другім пашывачным цэху і **Кац** у закройным цэху), вылучаныя з работніц. Планавікамі двух цэхаў з'яўляюцца жанчыны. Кіруе цэхавай канторай штамповачнага цэха таксама жанчына.

Аднак яшчэ не ўсё зроблена ў сэнсе вылучэння жанчын на кваліфікаваную работу, не гледзячы на тое, што для гэтага маюцца ўсе магчымасці. Зараз праводзіцца работа па далейшаму прасоўванню старых рабочых, у тым ліку і работніц, на кваліфікаваную работу. У швэйным аграгаце першага пашывачнага цэха вылучана на больш кваліфікаваную работу 10 работніц.

Сярод работніц нашай фабрыкі ёсць адзіночкі, якім мы аддаем асаблівую ўвагу. Так, старой работніцы фабрыкі **Паўлюц,** у якой чацвёра дзяцей, была дадзена вялікая дапамога (400 рублёў) для набыцця вопраткі дзецям.

Намі ўзят курс на сур'ёзнае абучэнне 30 работніц на працягу 4-га квартала з тым, каб яны працавалі на такіх важнейшых працэсах, як пашыўка, фрэзероўка, сцякленне, строчка саюзак.

Дырэктар ф-кі імя Кагановіча
Менск. А. БАБІЦКІ.

Другая маладосць

На дарозе з заплаканымі вачыма сядзела 10-гадовая дзяўчынка. З-за цёмнага сасновага лесу набліжалася вялікая хмара, якая пужала сіротку бліскучымі маланкамі. Хат блізка не было. Куды далей ісці—невядома.

Пад'ехала добрая брычка. Таўстая пані крычала, каб хутчэй паганялі, але коні крута павярнулі ў бок і сталі. Пані спалохалася:

— У чым справа? Што здарылася?

— Дзяўчынка вунь сядзіць на пяньку, мабыць сіротка. Трэба забраць яе ў маёнтак,—адказаў кашох.

— Хадзі сюды, дзяўчынка,—сказала пані.

Фейгіна падышла.

— Чаго ты тут сядзіш?

— Іду шукаць работу. Бацькоў не маю. Засталася круглай сіратой, а куды ісці—не ведаю. Вазьміце мяне з сабою. Я ўсё буду рабіць вам...

— Узяць то можна, але-ж дзе ты сядзеш? Побач са мною—нельга. Я гэтага не дазволю. А батрачка мне патрэбна.

— Я, пані, тут ззаду як-небудзь..

— Ну, чапляйся, толькі моцна трымайся,—не гаварыў нікому, што з паняй ехала на адной брычцы.

Фейгіна моцна трымалася ззаду за шарабанчык. Хутка звярнулі ўлева і засхалі ў маёнтак «Буцавічы».

— Ну, ідзі. У гэтай стоццы будзеш начаваць. Працаваць будзеш на малочнай ферме даяркай і наогул будзеш рабіць усякую работу.

— Дзякуй, пані.

Так пачалося. Толькі ўзыйдзе сонца, яна ўжо ля панскіх кароў. Доіць іх, корміць, а потым за кілометр носіць малако для пераапрацоўкі на масла і сыр.

— Не чуваць было рук,—ўспамінае Фейгіна. — Рана ўстанеш, набегаешся каля жывёлы, а калі каровы пойдуць у поле, мне знаходзяць другую работу.

Восем гадоў так жыла яна. Кожны год здаваўся за дзесяць. Панскія батракі пачалі яе ўгаварваць, каб яна вышла замуж за канюха **Гурына.**

— Хлапец ён добры і жыццё тваё сіроцкае палепшыцца.

— Я-ж яўрэйка, а ён беларус.

— Нічога, трэба толькі, каб ты прыняла праваслаўную веру. Поп цябе перахрысціць, а потым павянчаем.

Фейгіна адказала:

— Толькі-б ён быў такім працавітым, як я...

Вымушана была Фейгіна хрысціцца ў царкве і поўнасцю перамяніць сваё прозвішча і імя. Яна стала—Ольга Мікалаёўна Гурына.

Даведаўся рабін аб тым, што Фейгіна прыняла праваслаўную веру і тут-жа пастанавіў:—Забіць каменнем за ганьбу яўрэйскай веры.

Гарадская сінагога натравіла рэлігійных людзей, каб ажыццявіць гэту агідную пастанову.

І неяк раз у суботу, пасля абеду, да яе акна падышлі два чалавекі. Забілася сэрца ў Фейгінай, зразумела чаго яны прышлі і запчашіла моцна дзверы. Але нязваныя госці высадзілі вокны і, калі-б не падышоў панскі батрак, забілі-б яе.

Жыццё маладых не палепшылася. Не дапамагла і царква.

Цяжкое жыццё прымусіла іх кінуць маёнтак і пераехаць у Менск. Тут таксама не соладка. Жылося не лепш, чым у памешчыка.

На правільны шлях вывела Акцябрская рэволюцыя.

Зараз Фейгіна-Гурына — лепшая ўдарніца — герой першай пяцігодкі. Яна ўжо доўгі час працуе на фабрыцы імя Куйбышэва. За сваю работу прэміравана каштоўнымі падарункамі, грашыма і граматай.

З 1929 года яна член горсовета. Больш 7 год была членам горпрофсовета. Яна член КП(б)Б. Добра выконвае партабавязкі. Не гледзячы на ўзрост (больш 50 год) —акуратна наведвае школу.

Фейгіна-Гурына кажа:

— Жыццё маё, мая маладосць толькі пачынаецца. Жыву я зараз у трох добра абсталяваных пакоях. Прыдзеш з работы, можна адпачыць. Гэта не стопка пані Турэцкай.

Дзеці Гурынай працуюць на адказных работах. Старшы сын Мікалай — намеснік дырэктара Горкаўскага аўтарэмзавода, дачка Каця — адказны сакратар Наркомзнешгандля ў Маскве. Малодшы сын Пётр—вучыцца і працуе на заводзе імя Куйбышэва. Муж перайшоў на пенсію.

Фейгіна-Гурына праклінае сваё мінулае жыццё, праклінае царскі ўрад і рэлігію. **ВАЛЬФСОН Е. А.**

НАШЫ АКТЫВІСТКІ

Кожная жонка чыгуначніка павінна ведаць, як працуе яе муж, павінна дапамагчы транспарту. Такую задачу паставіў партком перад хатнімі гаспадынямі нашага вузла.

Многія ўзялі шэфства над стрэлачнымі пастамі.

Лепш за ўсіх працуе жонка дзяжурнага па станцыі Гомель-гаспадарчая — тав. **Мурынава.** Яна вельмі цікавіцца ў якім стане знаходзіцца ле падшэфны пост, як перадаецца дзяжурства, ці чыстыя стрэлкі. Аб усім гэтым яна дакладвае ўсёй змене на вытворчай нарадзе.

Аднойчы пры праверцы свайго паста тав. **Мурынава** выявіла брудныя бендары і шкло. Дзяжурыла стрэлачніца тав. **Чыкунова.** Тав. Мурынава паднесла гэта шкло Чыкуновай і пасароміла яе. Аб гэтым выпадку яна напісала заметку ў нашу газету «Движенец». За актыўную работу тав. Мурынава прэміравана.

Гарадскі камітэт партыі да кожнага стрэлачнага паста прымацаваў тэрытарыяльную арганізацыю. Кожная хатняя гаспадыня хадзіла да прымацаваных арганізатараў і патрабавала канкрэтнай дапамогі стрэлачнаму посту. Зараз вынікі відавочны. Стрэлачныя будкі адрамантаваны, афарбаваны і ўтульна абстаўлены.

Хатнія гаспадыні нашага вузла дапамагаюць у паляпшэнні работы транспарта. **МІЦЬКО Е. Н.**

Гомель.

Навіцкая Геня—строгаль менскага паравознага дэпо.

ДЖАМІЛЯ

(*Апавяданне*)

У ясную вясновую раніцу, калі зацвітае урук і міндаль, прывабліваючы залацістых пчолак сваімі пяшчотнымі ружовымі кветкамі, нарадзілася маленькая узбекская дзяўчынка Джаміля.

Гэта было ў той год, калі жанчыны Усхода сабраліся на свой першы жаночы з'езд. На гэтым з'ездзе была і Карамат-Бібі, маці маленькай Джамілі.

Гады плылі і журчалі, як вада ў арыку (канава). Расла і мацнела смуглянка Джамілі, ласкавая і вясёлая.

Калі Джаміля ўсміхалася, яе чорныя вочкі бліскучэлі, смуглы тварык ружавеў, як кветкі ў руках, а чорныя бровы, выгінаючыся, узнімаліся ўгару.

Маці любоўна заплятала дачцы чорныя касічкі, якія бахрамою спушчаліся на спіну з пад вышытай стракатымі шаўкамі аксамітнай шапачкі.

— Дачка мая, ты будзеш красуней і будзеш шчаслівай, — казала яна, цалуючы дзяўчынку.

— Мама, а што такое шчасце? — запытала дзесяцігадовая Джаміля.

Сумна і ціха адказала маці:

— Шчасце, джаным (любая), гэта птушка. Для адных яна прыляціць, паспявае і адляціць назаўсёды, а другім спявае і шчабеча ўсё жыццё.

— А ты, мама, бачыла гэту птушку? — дапытвалася дзяўчынка.

— Бачыла, родная, адзін толькі раз.

— Раскажы! — патрабавала дачка.

— Слухай, Джаміля, уважліва слухай. Калі тваёй маці было адзінаццаць гадоў, яе прадалі багатаму чалавеку...

— Навошта?

— Ах, мая ластаўка... Вось ты ўжо не будзеш перажываць гэтага. Цяпер закон не дазваляе выдаваць замуж раней 16 гадоў. Не дазваляе прадаваць жанчыну за калым (выкуп). А раней нашы багацеі стварылі такі закон, які дазваляў гэта. Мой бацька быў бядняк. Ён апрацоўваў чужую зямлю. Жылі мы галадаючы, а я была прыгожая. Калі мне споўнілася адзінаццаць гадоў, да нас у кішлак (сяло), прыехаў гандляр. Ён быў тоўсты, з чырвоным тварам і з густой рыжай барадой.

Дзяўчынка захлопала ў ладкі.

— Як у бацькі! Такі-ж тоўсты!

— Так, мая радасць, гэта быў твой бацька. Ён убачыў мяне на версе саклі (дом) і купіў за два кавалкі мануфактуры і 50 рублёў. Потым ён завёз мяне да сябе і зрабіў сваёй трэцяй жонкай. Я доўга хварэла, у мяне не было дзяцей. А гэта ў нас лічыцца вялікай ганьбай. З мяне здзекавалася і мучыла яго старэйшая жонка, старая і злосная Турсун. Яна лічылася гаспадыняй дома і камандвала намі. Шкада мне другой яго жонкі. З ёю мы пражылі пяць год у вялікай дружбе, але яна памёрла. Ой, мая Джаміля, цяжкая была доля ўзбечкі, покуль вялікі з вялікіх людзей — Ленін не напісаў свой закон.

— Мама, ты бачыла Леніна? Які ён? — І дзяўчынка паглядзела на маці бліскучымі вочкамі.

— Цішэй, джаным, цішэй... Каб бацька не ведаў, каб Турсун не ўбачыла... Нікому не кажы. Леніна няма цяпер, але вось глядзі.

І яна выцягнула са скрыні звязку ласкутоў і каляровых шаўкоў, якімі вышывала. Разгарнуўшы скрутак, яна асцярожна дастала партрэт Леніна і з пяшчотнасцю паказала дачцы.

— Вось ён, наш Ленін. Гэта далі нам на першым жаночым з'ездзе. Там мы пачулі аб тым, як Ленін і Сталін хочуць зрабіць шчаслівымі ўсіх людзей, якія цяжка працуюць. Гэтая вестка была шчасцем. Да гэтых часоў помніць твая бедная, хворая маці гэтую ясную птушку шчасця. Мне здавалася, што яна сядзела ў мяне на плячы і спявала так салодка і радасна. Шмат, шмат даведаліся мы ў той дзень. Як вясновыя воды з высокіх гор хлынулі жанчыны Усхода са сваіх душных ічкар (жаночая палова дома). Яны пачалі вучыцца і працаваць разам з усімі мужчынамі ў полі і на фабрыцы...

— Мама, я таксама буду на з'езды ездзіць, — задумна прамовіла дзяўчынка.

— Будзеш, мая спаўная. Падрасцеш і паедзеш... Многа смелых жанчын на з'ездзе скінулі паранджу (пакрывала) і зараз яны вялікімі людзьмі сталі. ДЖЫХАН ГАБІДАВА зараз намеснікам старшыні ЦВК Узбекістана. А раней яна была бязграматнай беднячкай.

— Мама, я не буду насіць паранджы. Я надзену чырвоны гальштук, як у Хасіят.

— Цішэй, джаным, цішэй. Пачуе Турсун і бяда будзе. Ой, вялікая бяда! Старая яна жанчына, моцна за старое трымаецца. Злая яна.

Да дзесяці год Джаміля, апранутая ў яркую доўгую кашулю, з вышытай шапачкай на галаве, бегала з суседнімі дзецьмі па пыльных вуліцах, распяваючы піонерскія песні. Яна была бойкая і смелая. Калі хлопчыкі крыўдзілі яе таварышак, яна моцна калаціла іх, прыгаварваючы:

—Не біся, не крыўдзі дзяўчынку... пайду ў комсамол паскарджуся на цябе.

***

А калі ружовыя, падобныя на ранішнюю зару кветкі ў руках пышна расцвіталі на старым дрэве, старая Турсун паклікала дзяўчынку на айван (балкон) і, пасадзіўшы яе каля сябе, строга сказала:

— Сёння табе споўнілася дзесяць год. Цяпер ты не дзіця, а нявеста. Хадзіць з адкрытым тварам — грэх. Вось я падрыхтавала шоўку. Сядзі і вышывай, а заўтра бацька купіць табе паранджу і ты будзеш выходзіць на вуліцу толькі са старэйшымі, закрываючы твар.

— Холя (цётка), а Хасіят не носіць паранджу, яна ходзіць у кароценькім плацці.

— Маўчы, маўчы, дрэнная дзяўчынка. Хасіят прадала сябе д'ябалу. Бацька заб'е цябе, калі даведаецца, што ты хочаш быць падобнай да Хасіят. Хасіят — дачка абранеша (возчыка), а ты дачка шаноўнага чалавека. Твой бацька займаўся гандлем. Праўда, зараз у яго няма сваёй крамы, але ўсё-ж такі ён шаноўны чалавек.

Уздыхнула Джаміля і села за вышыўку. Скоса паглядала яна на сумны твар сваёй маці, якая мыла бялізну пад паветкай.

Турмою здаваўся Джамілі маленькі двор абкружаны высокім плотам. За кожным рухам дзяўчынкі пільна сачылі злыя вочы старой Турсун. Ні бегаць, ні спяваць, ні гучна смяяцца — усё забаранялася.

— Жанчына павінна быць ціхай і яснай, як луна, — казала Турсун, спыняючы парывістыя рухі дзяўчынкі.

Толькі ўвечары, кладучыся спаць каля маці, Джаміля доўга распытвала яе аб першым з'ездзе, ці сама перадавала навіны, якія расказвала ёй, забраўшыся на плот, шустрая Хасіят.

Аднойчы прышоў дадому бацька і прынёс адрэз зялёнага шоўку. Усміхаючыся сказаў ён Карамат-Бібі:

— На, пашый дачцы плацце, яна хутка замуж пойдзе.

Жанчыны па звычаю маўчалі. Яны не адважваліся распытваць яго. Але чорнавокая Джаміля не спалохалася строгага бацькі:

— Бацька, хіба я зрабіла што-небудзь кепскае, што ты хочаш аддаць мяне са свайго дома. Бацька нахмурыў бровы і сказаў:

— Хіба замуж аддаюць за праступкі. Табе ўжо адзінаццаць год, а Юсуп Таджыбаеў чалавек са сродкамі, ты будзеш добра жыць.

Дзяўчынка ведала гэтага чорнабародага таўстуна.

— Не хачу! Не буду жонкай агіднага мясніка!.. Закон забараняе выдаваць замуж пад прымусам, — крычала ўсхваляваная Джаміля.

— Маўчы, шайтан (д'ябал). Ты адважваешся супярэчыць бацьку... Ты законы ведаеш... Заб'ю цябе, агідная сабака.

І як дзікі звер пачаў яе біць.

Глуха рыдала ў кутку маці. Не, не дазволіць яна пакалечыць сваё дзіця, сваю вясёлую птушку. Трэба ісці туды, дзе прыгнечаная жанчына можа знайсці абарону.

І раніцою дзве шчыльна закутаныя фігуры падышлі да будынку, у якім змяшчаўся комсамол. Доўга не адважваліся яны зайсці. Але вось дзверы адчыніліся і на ганак выбегла вясёлая, стрыжаная піонерка.

— Хасіят! — радасна ўскрыкнула Джаміля і кінулася да таварышкі.

Страх як рукой зняло. Усе трое зайшлі ў кабінет сакратара.

— Керым! — здзівілася Карамат-Бібі.

Перад ёю быў сын старэйшай сястры. Пяць год таму назад сястра паступіла на фабрыку і муж забараніў Карамат-Бібі сустракацца з ёй.

Керым распытаў аб усім падрабязна і сказаў:

— Вяселле прызначана праз пяць дзён. Ну, дык вось што: вы рыхтуйцеся і не палохайцеся — вяселля не будзе. А ты, цётка, паступай на цукерную фабрыку. Там працуе і маці. Даволі сядзець табе за сцяной. Дарога ў жыццё шырока адкрыта для былой затворніцы.

Звонка залівалася свірэль, дробна рассыпаўся бой барабанаў, калі ў яркім, шоўкавым халаце тоўсты Юсуп Таджыбаеў з натоўпам гасцей падышоў да саклі Ішмата. Усе суседзі сабраліся, каб паглядзець на юную нявесту. Але раптам з суседняга дому вышаў Керым з двума комсамольцамі і міліцыянерам. Яны падышлі да нявесты і голасна запыталі:

— Джаміля Ішматава, колькі табе год?

— Адзінаццаць! — прагучэў адказ з пад валасянай сеткі, якая закрывала яе твар.

— Джаміля! Ты па сваёй ахвоце выходзіш замуж за Юсупа Таджыбаева?

— Не! Бацька прымусіў, ён пабіў мяне за адмаўленне.

Міліцыянер адчыніў папку, склаў пратакол і заявіў:

—Грамадзяне, можаце разыходзіцца. Вяселля не будзе. За парушэнне закону абодва грамадзяніна Ішматаў і Таджыбаеў прыцягваюцца да судовай адказнасці.

***

Доўга спрачаўся Ішматаў з Таджыбаевым у папраўчым доме за калым, які заплаціў Юсуп.

А Карамат-Бібі пачала новае жыццё, памаладзела, паздаравела яна. Збылася мара яе. Яна лепшая ўдарніца на фабрыцы, а сонейка яе — прыгожая Джаміля вучыцца ў школе.

АЛМАЦІНСКАЯ А.



СЫНЫ РАДЗІМЫ

1914 год. Мабілізацыя.

На вуліцах Менска слёзы і плач жанчын. П'яныя галасы новабранцаў, крык дзяцей, лаянка. У зашмальцаваных кепі, у сялянскіх світках плыве стракатая маса на зборны пункт. З торбамі за плячыма ідуць яны служыць беламу цару.

Дзесьці надрыўна пад гармонік прарываецца песня:

«Нас радзіменькіх пагонящь
На германскую вайну.
Нас радзіменькіх пакосящь,
Як зялёную траву».

— А куды-ж ты, родненькі, на каго-ж нас пакідаеш?

Чорныя ўспаміны мінулага яшчэ жывуць у памяці многіх бацькоў, якія сёння з радасцю праваджаюць сваіх сыноў у Чырвоную армію.

Сёння ў Менску на дзіва светлы і прыгожы дзень. Чырвоныя сцягі і плакаты на кожнай вуліцы. Прызываецца 1913 год. З музыкай выпраўляюць фабрыкі і заводы моцных, слаўных малайцоў у Чырвоную армію.

Дружнымі песнямі запаўняюць прызыўнікі вуліцы чырвонай сталіцы. Пастроенымі калонамі ідуць яны — сыны сваёй радзімы на зборны пункт. Тут сёння людна.

Па святочнаму ўбраны клуб імя Сталіна гасцёўна сустракае будучых байцоў. Да стала камісіі — чарга.

— **Мірончык** Фёдар! — выклікае старшыня.

— Ёсць!—адзываецца ўпэўнены голас. Да стала падыходзіць здаровы, плячысты хлапец. Ён—рабочы завода імя Молатава. Ударнік. Варашылаўскі стралок. У армію ідзе з вялікай ахвотай.

Пасля кароткай гутаркі старшыня паведамляе вынікі:

— Залічан ва флот! Задаволен?

— Дужа! Мне даўно хацелася на лінкор.

Радасны выходзіць Мірончык за дзверы. Яго акружаюць таварышы:

— Ну, як, Федзя?

— Залічан ва флот!

— Здорава! Значыцца на лінкор! Ну-ну...

Наступным выклікаецца **Чарняўскі** Трафім. Ён трактарыст-брыгадзір. Лепшы ўдарнік. Сёлета атрымаў падзяку за паспяховае выкананне вясновай ўспашкі. Яго на зборны пункт праводзіла жонка. Жыццерадасная, яна цярпліва чакала вынікаў камісіі. І калі муж паведаміў, што залічан у мотамехчасць, яны абодва радасна ўсміхнуліся:

— Значыцца танкістам буду, Грыпіна. Як табе падабаецца?

— Не прэнта, Трафім. Глядзі-ж не асаромся, добра служы. Дзіцё я дагледжу сама, ну дый яслі дапамогуць, зразумела.

Наступным праходзіць камісію слёсар трамвайнага парка, зотавец — **Ваўчок** Міхась. Бацька яго — батрак, стары партызан. Браты служаць у Чырвонай арміі. Сам Міхась у армію ідзе з вялікай ахвотай. Прызначэннем у мотамехчасць Міхась дужа задаволен.

— Цяпер я слесар, — кажа ён.

— Паслужу ў Чырвонай арміі — буду механікам. Люблю я гэту справу. А тут работа з танкам, механізмы. Хутчэй-бы накіравалі ў часць.

Любімая дзяўчына Міхася Нюра замілавана глядзіць на яго—будучага танкіста ў скураным шлёме і сінім камбінезоне.

Яна горача ціснe яму руку і ласкава гаворыць:

— Шчасліва, Міша! Жадаю поспехаў.

Так ідзе на прызыў новая змена чырвоных байцоў — лепшыя ўдарнікі, слёсары, трактарысты, калгаснікі. Яны не помняць гарадавога і жандарма. Яны не ведаюць пекла царскай казармы. Аб гэтым расказваюць бацькі, выпраўляючы сваіх сыноў абараняць адзіную ў свеце бацькаўшчыну працоўных — СССР.

Упэўненыя, бадзёрыя ідуць яны на свае баявыя пасты — самалёты, танкі, лінкоры, у конніцу, пяхоту. артылерыю.

Яны верныя сыны сваёй радзімы!

С. ДАРОЖНЫ.

ЧЫМ МЫ НЕЗАДАВОЛЕНЫ

РЭДАКЦЫЯ НАШАГА ЖУРНАЛА РАЗАМ З ШМАТТЫРАЖКАЙ ГОМЕЛЬСКАЙ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «КОМІНТЭРН» ПРАВЯЛА РАБКОРАЎСКІ РЭЙД ПА ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАННЯ ПАСТАНОВЫ ЦК ВКП(б) «АБ ПРАВЯДЗЕННІ МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА КАМУНІСТЫЧНАГА ДНЯ 8 САКАВІКА». НІЖЭЙ МЫ ДРУКУЕМ АТРЫМАНЫЯ НАМІ МАТЭРЫЯЛЫ РАБКОРАК ПА ГЭТАМУ РЭЙДУ.

Прайшло ўжо шэсць месяцаў пасля таго, як на нашай фабрыцы прагучала прамову т. **Сталіна** на выпуску акадэмікаў. І партком, і фабком намецілі тады рад мерапрыемстваў па вылучэнню і вырошчванню новых кадраў. На жаль, мерапрыемствы гэтыя вельмі дрэнна праводзяцца ў жыццё. Асабліва ў адносінах да работніц.

У піджачна-суконным цэху (змена тав. **Марголіна)** з 127 рабочых 97 работніц, а на кіруючай рабоце няма ні адной. Праўда, тав. **Рончыкава** была вылучана кантралёрам па якасці, але, не атрымаўшы дапамогі з боку адміністрацыі, яна вымушана была вярнуцца да станка.

Ёсць многа фактаў, калі ў гэтым цэху старыя работніцы работаюць на самых нізкіх разрадах. Так, тав. **Аўласевіч** працуе на фабрыцы 6 год. Выдатніца, лепшая ўдарніца і прафорг сталінскай брыгады. Яна мае вялікае жаданне павысіць сваю кваліфікацыю. Скончыла першы курс ПТК (курсы павышэння тэхнічнай кваліфікацыі). Увесь час Аўласевіч працуе на трэцім разрадзе. Тое-ж самае і з тав. **Шнейдэрман,** якая доўга працуе па другому разраду.

ВЕРТГЕЙМ, ШАЦЬКО.

***

На фабрыцы шапачны цэх амаль новы. Больш паловы рабочых прышло работаць зусім нядаўна, не ведаючы тэхналогіі працэса. Але нашы старэйшыя рабочыя і інструктары данамагаюць навічкам павышаць сваю кваліфікацыю. Многія з іх ужо работаюць на «выдатна», як **Рэвенкова, Тысленка** і іншыя.

Горш абстаіць справа ў брыгадзе Левітана. Там якасць прадукцыі нездавальняючая, а тэхвучоба ў брыгадзе зрываецца. Рабочыя **Зайчык, Брэгер** і **Песіна** зусім не наведваюць заняткаў. Ёсць у нас і факты парушэння працоўнай дысцыпліны. Работніца **Зайчык** у часе работы ходзіць у кааператыў за хлебам. Гэтыя недахопы неабходна выправіць.

ДРЭЙЗЕР, ГАЙСЮК, КІВЕЛЬСКІ.

***

У жылетачным цэху работаюць 24 дзяўчыны. Амаль усе здалі тэхэкзамен на «выдатна». Гэта мае вялікі адбітак на выкананні промфінплана. Ёсць у нас у цэху і сталінская брыгада. Яна працуе па вопыту менжынцаў; брыгада дае лепшыя вытворчыя паказчыкі ў рабоце.

Работніцы нашы ўсе вучацца і маюць грамадскія нагрузкі. Толькі дрэнна, што не праводзяцца палітгутаркі. Палітінфарматар пайшла на вучобу, а другога не вылучаюць.

Мала цікавяцца нашы фабрычныя арганізацыі бытавымі ўмовамі работніц. Старая работніца тав. **Фідлер** вельмі нуждаецца ў кватэры, а фабком аб гэтым не клапоціцца. Не на належнай вышыні і медычнае абслугоўванне работніц. Доктар медпункта ў цэху не бывае. Няма таксама і аптэчкі.

СТАРОБІНЕЦ.

***

Нельга сказаць, каб у закройным цэху не вылучалі работніц на лепшыя і больш кваліфікаваныя працэсы. За апошні час **Трунеўская** пераведзены з трэцяга на чацверты разрад. На лепшыя і больш кваліфікаваныя работы пераведзены таксама работніцы **Зыбенюк, Голігер, Шульц** і **Воўкава.** Усе яны тэхэкзамен здалі на «выдатна». Аднак, ёсць факты, калі старыя работніцы не пераводзяцца на вышэйшыя разрады. Так, тав. **Каган** пяць гадоў ужо работае па трэцяму разраду.

Горшае становішча з канторскімі работніцамі. Маюцца работніцы, якія работаюць па пяць гадоў, але іх кваліфікацыя не павышаецца. Ніхто з канторскіх работніц не ахоплен вучобай. Галоўны бухгалтар тав. **Вермул** нічога не робіць, каб павысіць кваліфікацыю канторшчыц.

ФРАДЗІНА.

Мама Моціка

Моцік носіцца з газетай
(Яму толькі сем гадоў),
Яшчэ здалёку прыкметны
Вочкаў бляск і валасоў.
Чаму-ж носіць ён газету?
Што пільнуе з ранніх пор?
Яго мама на партрэце,
Бач, завінчвае матор.
Моцік сёння тут героем:
— Гляньце толькі, хлопцы!
Эх!
Тут напісана такое...
Ганарыцца мамай цэх.
Ў класе радасць так і свеціць...
— Моцік, мне!.. (бурліць рака...)
Абступілі яго дзеці,
Слаўны здымак у руках.
Тут бярэ газету Кіма:
— Ну, рэбята,
Гляньце,
Эх!
Прачытаю, вось усім вам:
— «Ганарыцца ёю цэх»...
Прапаноўваю за гэта...
— Прапанова і ў мяне...
— Мамы Моціка партрэт, каб
Тут павесіць на сцяне.
Верна! Так! — і ходзяць ходам
Вочкі, ручкі... Ўсе гурбой:
— Мама, ўдарніца завода,
Упрыгожыць наш пакой!..
Міг— і ўжо за справай дзеці,—
Малаточкам б'юць яны...
Мама побач з Кларай Цэткін
Паглядае са сцяны.

Пераклад з яўрэйскай мовы Юркі Лявоннага.

НА „СПАРТАКУ“

На нашай фабрыцы працуе 339 жанчын. Гэта амаль палова колькасці ўсіх фабрычных рабочых. Зразумела, што для нас справа вырошчвання і вылучэння жаночых кадраў мае вялікае значэнне. На жаль, з гэтым пытаннем у нас справы абстаяць дрэнна.

Перасоўванне на вышэйшыя кваліфікацыі ў нас праводзіцца выпадкова. Па ўсёй фабрыцы няма ні адной работніцы 7—8 разраду. Ні адной работніцы вядучай прафесіі, калі не лічыць тав. **Жураўскай,** якая замяняе сушыльшчыкаў у час іхняга адпачынку. А тав. Жураўская здольная работніца, добра асвоіла тэхніку вытворчасці.

Няма работніц і на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Толькі ў пакамерным і трапічным цэху маецца чатыры кантрольных мастацтвы. Гэтыя старыя работніцы, працуюць па 20—25 гадоў на вытворчасці, добра спраўляюцца з работай, але далей іх чамусьці не перасоўваюць. Вось тав. **Булановіч** — працуе старшай мастацтвы 14—15 гадоў, граматная, добрая работніца, адданы член партыі. Яе можна было-б вылучыць на адміністрацыйную работу. Але ні дырэктар тав. **Халамянюк,** ні сакратар парткома тав. **Харытонаў** аб гэтым не падумалі. Такіх работніц на фабрыцы шмат.

Ёсць у нас і такія факты, калі былыя вылучэнкі вымушаны былі вярнуцца зноў да станка, таму што ім не дапамаглі ў рабоце. Так было з тав. **Дземянчык, Рэўцкай** і іншымі.

Дрэнна абстаіць справа і з культурна-масавай работай на фабрыцы. 30 чалавек зусім непраграматныя, большасць з іх жанчыны. Між тым фабком ніякіх мер не прымае, каб арганізаваць вучобу. Заняткі школы пры фабрыцы яшчэ не распачаліся. Ліквбезу таксама няма. А як многа маглі-б зрабіць па ліквідацыі непраграматнасці работніцы канторы, комсамолкі і культармейцы, калі-б іх да гэтай справы прыцягнулі. Ёсць на фабрыцы і вялікі клуб, але ў ім, акрамя танцаў за грошы, ніякай работы не бывае. Гурткі самадзейнасці не працуюць. Клуб да зімы не адрамантаван.

Не падрыхтаваны да зімы і яслі. Два месяцы таму назад там пачалі рамонт, але канца яшчэ не відаць. У яслях няма прыбіральні, няма сушылкі для бялізны. Такое становішча ў яслях мае вялікі ўплыў на бытавыя ўмовы рабочых.

Фабрыка «Спартак» па выкананню промфінплана мае не дрэнныя паказчыкі, але работа магла-б ісці значна лепш, калі-б кіруючыя арганізацыі фабрыкі сапраўды ўзяліся за вырошчванне людзей і палепшанне культурна-масавай работы.

КАЗЛОВА.

Шклоў.

***

Пытаннем вылучэння моладзі і асабліва жаночай на фабрыцы «Спартак» ніхто не займаецца. Гэта пытанне ні разу не разглядалася грамадскімі арганізацыямі, у прыватнасці, фабкомам. Загадчыкі цэхаў узвальваюць справу перасоўвання моладзі на аддзел кадраў, а аддзел кадраў—на загадчыкаў цэхаў.

На фабрыцы маецца шмат дзяўчат, якія могуць працаваць на больш адказных работах. Узяць, напрыклад, тав. **Галецкую.** Яна працуе на прэсе трэцяй пастаровай машыны пяць год. Экзамен па тэхмінімуму здала на «добра». Мае жаданне перайсці ў электраадзел, або апаратурны. Але яе жаданне застаецца марай. Тав. **Моціна,** якая працуе таксама каля пяці год, жадае сваю кваліфікацыю прэсавой перамяніць на перакатчыцу, але гэтай магчымасці яна не мае. **Панфіловіч** М.—дзесяць год працуе на перакатным станку і таксама далей не перасоўваецца.

Праўда, трох дзяўчат: тав. **Герман, Бароўскую** і **Маеўскую** вылучылі ў лабараторыю. Але гэта справа прайшла самацёкам. Сістэма перасоўвання не выпрацавана. Былі нават і такія выпадкі, калі жанчын ставілі на вышэйшую кваліфікацыю, а потым іх адтуль знімалі, калі з'яўлялася магчымасць паставіць мужчын. Так было з **Яцкевіч** Дуняй — добрай работніцай фабрыкі, ударніцай, прэміраванай некалькі разоў. Яна была вылучана старшым рольшчыкам, а зараз пераведзена падручнай.

Комсамольскі камітэт фабрыкі недалёка адышоў і ад фабкома. Яго пытанне перасоўвання моладзі, як быццам, не цікавіць.

НАРБУТ КЛАЎДЗІЯ.

Шклоў.

РАДАСЦЬ ДЗЯЎЧАТ

— У вас «бабье царства» — чуем мы часта жартаўлівыя заўвагі калгаснікаў. І сапраўды, з 15 комсамольцаў у нашай пярвічнай арганізацыі — 11 дзяўчат. Комсоргам у нас таксама дзяўчына — **Герасімава Ганна.**

Дзяўчаты нашы сапраўдныя перадавікі ў калгаснай рабоце. Норму выпрацоўкі заўсёды перавыконваюць. Нядаўна наша пярвічная арганізацыя ездзіла ў калгас «Новы шлях» на ліквідацыю прарыва.

Сістэматычна ў нас праводзіцца выхаваўчая работа сярод моладзі. Заняткі ў палітшколе наведваюць усе комсамольцы і многа беспартыйных. Тры разы ў месяц бываюць комсамольскія сходы.

Не сумна праходзяць і вечары. Маецца ў нас драматычны і танцавальны гурткі. На 11 ліпеня наш танцавальны гурток ездзіў у Шклоў і прымаў удзел у выступленнях на ўрачыстым вечары. Радасці дзяўчат не было канца!

У мінулым годзе па ініцыятыве комсамольцаў у калгасе пабудавалі клуб. Толькі дрэнна ён яшчэ ў нас абсталёван. Да 18 гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі мы пастараемся абсталяваць яго, завядзем шашкі, шахматы, даміно, зробім печку.

Усе нашы комсамольцы выпісваюць газету «Чырвоная змена». Усе комсамолкі таксама падпісаліся на журнал «Работніца і калгаснiца Беларусі». У калгасе ў нас няма такога двара, у якім-бы не выпісвалі газет.

Комсамолкі нашы—добрыя актывісткі. Вось былая батрачка **Андросава Пелагея** выбрана членам сельсавета і намеснікам старшыні. Яна таксама намеснік брыгадзіра паляводчай брыгады. У сельсавеце працуе актыўна. Як значны чалавек калгаса была ў Менску на ўсенароднym свяце

У ДЗЯЦЕИ

У вялікім фруктовым садзе сярод мноства кветак стаіць двухпавярховы будынак яслей № 8.

Светлыя, утульныя пакоі, з афарбаванымі падлогамі, з упрыгожанымі сценамі і добрай мэбляй запоўнены дзіцячым гомонам.

Вось цягне каня за «грыву» **Валя Саўцоў.** Любіць Валя коней, як кажуць, па спадчыне. Бацька яго—камандзір-кавалерыст.

Вось рыхтуецца да прагулкі старэйшая група. А грудзячкі з пухленькімі ручкамі хапаюцца за цацкі ў манежы. Ад задавальнення ўсміхаюцца іх мілыя, ружовыя тварыкі.

За апошні год яслі сталі непазнавальнымі. Горздраў паслаў туды моцных работнікаў—загадчыцу тав. **Фейгіну** і доктара **Мінскер.** Новыя кіраўнікі разам з усім калектывам зрабілі яслі сапраўды культурнай установай.

У яслях першых па Менску пабудавалі для дзяцей душ. Ёсць таксама свая невялічкая гаспадарка. Гадуецца кабан і некалькі парасят. Маюцца хатнія птушкі, яйкі ад якіх ідуць дзецям.

Дзяцей добра кормяць. Кожны раз яны атрымліваюць смачную, высокакаларыйную страву. Цікава адзначыць такі факт. Нядаўна тры тыдні ў яслях быў карантын. Дзеці ўвесь час знаходзіліся ў яслях і бацькам да дому іх не давалі нават на выходны дзень. За гэтыя тры тыдні дзеці значна прыбылі ў вазе. Некаторых дзяцей маткі ледзь пазналі.

Чыстата ў яслях бездакорная. Ложкі прыбраны кружаўнымі капамі і накідкамі. Строга выконваюцца і правілы ўнутранага распарадку. Своечасова чарадуюцца гульні, адпачынак і яда.

125 рэбят у яслях № 8 маюць шчаслівае дзяцінства. Выхоўваюць іх людзі, любячыя сваю справу.

ЭЦІНА.

Менск.

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч** у Менскім піонер-лагеры імя Косарэва.

Фото ГРЫНА.





У менскіх яслях № 8.

Фото КУРСЕВІЧА.

РАДЖАИЦЕ У РАДЗІЛЬНЫМ ДОМЕ АБО У БОЛЬНІЦЫ

Да Окцябрскай рэволюцыі на вёсцы раджалі без усякай медычнай дапамогі. Пры родах прысутнічала толькі цёмная, брудная бабка-павітуха, якая не ведала нават, як павінны адбывацца роды, якія роды правільныя і якія няправільныя. У выніку сваёй некультурнасці бабкі часта ператвараліі нармальныя роды ў ненармальныя, і рожаніца плаціла за гэта жыццём.

Перш за ўсё бабка не ведала аб тым, што пры родах патрэбна захоўваць абсалютную чыстату, што, з'явіўшыся да рожаніцы, трэба ачысціць яе пакой ад лішняй мэблі, ад усякага смецця, пылу, павуціння і т. п., што пасцель і бялізна павінны быць чыстыя, што трэба прыгатаваць пракіпячоную ваду ў чыстай пасудзе, пракіпячоную вату і мець пад рукой некаторыя лякарствы.

Баба-павітуха не ведала, што яна павінна ачысціць рукі, ногі і жывот рожаніцы ад бруду, што яна павінна каля 10 мінут мыць свае рукі цёплай вадой, шчоткай, мылам і спіртам; што патрэбна клізмай ачысціць кішочнік рожаніцы, абмыць знадворныя палавыя часткі пракіпячонай вадой; што без патрэбы нельга дакранацца да палавых частак і, самае галоўнае, не трэба пальцамі лазіць у палавы канал, гэта значыць даследваць рожаніцу.

Што-ж робіць бабка?

Яна, не абмыўшы рожаніцу, кладзе яе на брудную пасцель, накрывае кажухом, падкладае пад яе рознае рыззё, лічачы, што ў часе родаў ўсё роўна ўсё забрудзіцца. Аб пракіпячонай вадзе і чыстай ваце і не думае. Сваіх брудных рук не мые, часта лазіць гэтымі рукамі ў палавыя органы, мажа іх лампадным або іншым брудным маслам, думаючы, што роды ад гэтага пойдуць хутчэй. Яна не разумее, што **ўсім гэтым яна ўносіць у палавыя органы рожаніцы заразу,** чым выклікае заражэнне крыві.

Калі роды зацягваюцца і схваткі слабеюць, бабка пачынае мучыць рожаніцу: яна водзіць як парыцца ў лазню, або ставіць над чыгуном з кіпячонай вадой, падвешвае яе, ціскае ёй жывот, яшчэ часцей засоўвае свае пальцы ў праход. Гэтым яна толькі стамляе рожаніцу: схваткі робяцца яшчэ больш слабымі. Тады бабка пальцамі, або што яшчэ горш, якім-небудзь іржавым цвіком разрывае плодны пузыр. Ад нясвоечасовага адыходжання вод роды яшчэ больш зацягваюцца. Тады ўжо і **жыццю дзіцяці пагражае небяспека.** Але вось на шчасце, пачаліся патугі і пачынае паказвацца галоўка дзіцяці. Тут бабка зноў пачынае «гаспадарыць» і «дапамагаць». Зноў мажа маслам і зноў пачынае расцягваць праход, ад чаго бываюць **разрывы знадворных палавых частак** і розныя параненні на іх. Бабка, безумоўна, не ведае, як зашываць іх і наогул не звяртае на іх ніякай ўвагі. А між тым за гэтыя незашытыя разрывы жанчына дорага расплачваецца.

Па-першае, калі на гэтыя раны і разрывы пападае бруд, то яны заражаюцца. На іх ўтвараюцца язвы, і ад гэтага можа быць заражэнне крыві.

Па-другое, ад незашытых разрываў праз некалькі год робіцца апушчэнне і выпадзенне ўлагалішча, а ў старасці — і выпадзенне маткі. І сапраўды, колькі жанчын, якія некалі раджалі пры дапамозе бабак, пакутуюць цяпер ад гэтай хваробы. Колькі працоўных сялянак сталі па гэтай прычыне непрацаздольнымі. Выпадзенне маткі — гэта цяжкая хвароба, якая патрабуе сур'ёзнай аперацыі, а ў глыбокіх старух, з прычыны іх слабасці, аперацыя немагчыма.

Вось ужо нарадзілася дзіця, і, на шчасце, яно жывое. У хаце радасць. Але дзіцячае месца (паслед, або «пасцель») яшчэ не выйшла. У бабкі няма цярпення. Яна не чакае, пакуль месца само выйдзе. Яна цягне за пупавіну, каб выцягнуць паслед. Пры гэтым частка яго адрываецца, застаецца ў матцы і пачынае там гнаіцца. Вы цякае вельмі многа крыві і апрача таго частка месца, якая загнілася, з'яўляецца новай крыніцай для заражэння крыві. І ад гэтай «дапамогі» бабак загінулі на вёсцы шмат маладых і здаровых жанчын таму толькі, што бабка нармальныя роды зрабіла ненармальнымі.

Толькі ўрач, або акушэрка могуць распазнаць правільнае або няправільнае палажэнне дзіцяці, ці ідзе дзіця галоўкай і наперад патыліцай (гэта правільнае палажэнне), або яно ідзе задком, ножкамі, або-ж ляжыць упоперак (гэтыя палажэнні няправільныя).

Бабка даведваецца аб ненармальным палажэнні дзіцяці толькі тады, калі пачынае паказвацца або выходзіць ножка ці ручка, або ягадзіцы ці бачок. Каб дапамагчы рожаніцы, яна прымяняе самыя недазволеныя спосабы і прыёмы. Нам вядомы выпадкі, калі бабка пягнула дзіця за выпаўшую ручку і адарвала яе. Такім-жа чынам другая адарвала галоўку ад тулава, а трэцяя цвіком пракалвала чэрап дзіцяці. Такая «дапамога» канчалася тым, што матка разрывалася і жанчына праз некалькі гадзін паміралa, не нарадзіўшы дзіця.

Такія няправільныя роды бабка растлумачвае тым, што дзіця «прырасло». На самой справе дзіця ніколі не прырастае.

Калі роды зацягваліся, пускалі ў ход «святыя» і «пябесныя» сілы; малітвы, свечы, абразы. Усе гэтыя сродкі і «памочнікі», зразумела, не выратоўвалі жанчыну ад гібелі, вінавайцай якой з'яўлялася бабка.

Не тое бывае, калі пры родах **прысутнічае акушэрка.** Прыпоўшы да рожаніцы надоўга, яна з сабою прыносіць усе прылады, якія патрэбны для вядзення родаў, і стварае ўсе ўмовы, якія патрэбны для рожаніцы.

Яшчэ лепш, калі жанчына **адпраўляецца** ў радзільны дом або ў больніцу, каб там праводзіць свае роды. Там яна забяспечана ўсім, што трэба пры родах; там на месцы ўсё ёсць пад рукамі—і чысты ложак, і цыратка, і падкладное сулно, і розныя лякарствы, і інструменты. Тут яе абмываюць пад душам і надзяюць ёй чыстую бялізну. Тут на месцы ёсць і акушэрка, і сядзелка, і ўрач.

Акрамя таго, рожаніца знаходзіцца ў светлым памяшканні з чыстым павеграм. Рэдка якая рожаніца ў такіх умовах захворвае, а яшчэ радзей хто-небудзь тут паміраe ад родаў. Тут часта выратоўваюць жыццё маці і дзіцяці, якія безумоўна, пры іншых (хатніх) абставінах загінулі-б. Нядарма ў гарадах ні адна жанчына не раджае надаму, а стараецца абавязкова раджаць у радзільным доме.

А таму ўсе жанчыны павінны раджаць у родадапаможнай ўстанове або ў больніцы, а калі гэта па якіх-небудзь уважлівых прычынах немагчыма і прыходзіцца раджаць дома, то неабходна выклікаць на роды акушэрку.

П-р ПОПЯК

Кошт нумару 10 кап.

САМЫЯ МАЛЕНЬКІЯ

Вялікі, светлы пакой. Амаль цацкавыя сталы і табурэцікі. За сталамі сядзяць чыстыя, акуратна апрануты вучні, самыя маленькія вучні школ, якія ўперпыню селі за кніжку. У класе цішыня. Дзеці ўважліва слухаюць настаўніцу. Ідзе чарговы ўрок. Тэма ўрока — восень.

Ля класнай дошкі настаўніца тав. **Багатырова.**

— Ну, дзеці, — пытаецца яна, — хто можа сказаць, якія галоўныя адзнакі восені?

Устае белакуры хлапчук Юра **Клімаў.** Ён гаворыць важным голасам добра асвядомленага чалавека.

— Асеннее сопейка не так грэе. Робіцца халаднеі. На дрэвах жаўцеюць лісты і птушкі ад нас адлятаюць.

— Дзеці, а чаму адлятаюць птушкі? — зноў пытаецца настаўніца.

Пытанне дужа зацікавіла ўсіх. Жадаючых адказаць многа, але і тут адчуваецца добрая дысцыпліна дзяцей. Ніхто самавольна не загаворыць, а цярпліва з узнятай угару ручкай чакае выкліку настаўніцы. Настаўніца выклікае Лёню **Стаградскага.** Лёня адказвае, што птушкі адлятаюць таму, што ім тут холадна, і што мошкі, якімі яны кормяцца, хаваюцца на зімоўку пад кару.

Пасля Лёні выказваюцца яшчэ многія вучні. Амаль усе яны даюць правільныя адказы, якія сведчаць аб разумовым развіцці дзяцей.

Большасць вучняў прышлі ў школу з дзіцячых садоў. Тут ў школе можна наглядаць, як багата добрага і карыснага дае нашаму дзіцяці дзіцячы сад. Выхаванцы дзіцячых садоў звычайна больш развітыя і дысцыплінаваныя і больш смелыя, чым «аднаасобнікі». І гэта зразумела — яны з першых-жа год прывыкаюць да калектыва, да людзей. Пераход з дзіцячага сада ў школу не з'яўляецца для іх такім рэзкім, як для «аднаасобнікаў».

Настаўніца тав. **Багатырова** задаволена сваім класам. Яна кажа, што дзеці, якія прышлі ў гэтым годзе з дзіцячых садоў, больш дысцыплінаваныя і развітыя, чым у мінулыя гады. Гэта сведчыць аб паляпшанні выхаваўчай работы ў нашых дашкольных установах.

Р. ВЕЛЬТМАН.

Віцебск, 6 школа.

„РАБОТНІЦУ І КАЛГАСНІЦУ БЕЛАРУСІ“— У МАСЫ

Як ні сорамна, але да гэтага часу ў нашым калгасе жанчыны не выпісвалі журнала «Работніца і калгасніца Беларусі». Лістаносец **Прышывалка** Саша мала цікавілася яго распаўсюджаннем.

Гэтымі днямі ў нас была нарада жаночага актыва. Азнаёміліся са зместам журнала. Дужа спадабаліся нашым калгасніцам артыкулы і нарысы аб рабоце лепшых ударніц прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Вельмі каштоўны для нас парады доктара.

У гэты вечар усе актывісткі падпісаліся на журнал на 3 месяцы — да канца 1935 года. Падпіску працягваем. Я, як старшыня калгаса, вяду растлумачальную работу сярод калгасніц з тым, каб не было ні адной калгасніцы без свайго журнала.

Выклікаю ўсіх старшынь калгасаў нашага раёна паследваць майму прыкладу.

Старшыня калгаса «Ударнік»

ГАННА ПЕХОТА.

Чэрвеньскі раён.

Работніцы, жонкі рабочых, калгасніцы, поацоўныя аднаасобніцы!

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„Работніца і калгасніца Беларусі“

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў 4 руб. 80 кап. | На 3 месяцы 1 руб. 20 кап.
„ 6 „ 2 „ 40 „ | „ 1 „ — „ 40 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых адцзяленнях і ў лістаносцаў

У КОЖНЫМ НУМАРЫ ПАДПІСЧЫКАМ ДАСЫЛАЕЦЦА БЯСПЛАТНА ЎКЛАДКА-ВЫКРАЙКА

Выданне ЦК КП(б)Б

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Ленінская 13, клуб друкароў, 2-гі паверх. Тэл. 22-415.

Друкарня «Звязды». Тыраж 8708 экз. Уп. Галоўлітбела № 2943.
Падпісана да друку 14.х—35 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.